

КАМУ І ЧАМУ БАЛІЦЬ ГАЛАВА? **4**

ЯК ПРАВІЛЬНА АБСЛУЖЫЦЬ ЧАЛАВЕКА З ІНВАЛІДНАСЦЮ **11**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 116 (28732)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр САБОДЗІН, дырэктар ААА «Альпары Еўразія»:**

*«Рост крэдытнага партфеля фізічных асоб адбываецца на фоне макраэканамічнай стабілізацыі, запавolення інфляцыі, росту ВУП. Ды і дзякуючы дзеянням Нацбанка ў найбліжэйшы час узрушэнняў на фінансавым рынку, якія маглі б прывесці да пагаршэння сітуацыі з крэдытаваннем фізічных асоб, не прадбачыцца. Няма рызыкі рэзкай дэвальвацыі, росту цэн або агульна-эканамічнага крызісу, якія мог бы прывесці да рэзкага падзення заробкаў і занятасці і ўскладняў бы для пазычальнікаў вяртанне крэдытаў».*

# ПА-БРАТЭРСКУ

## Калі ў Саюзнай дзяржаве ўзнікаюць нейкія пытанні, іх трэба вырашаць не адкладваючы



Фота БелТА.

**Учора ў Мінску адбылося пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, у якім узялі ўдзел прэзідэнты Беларусі і Расіі — Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін. З расійскага боку ў сталіцу Беларусі таксама прыбылі прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў, кіраўнікі палат парламента Валянціна Мацвіенка і Вячаслаў Валодзін.**

### Высокія чаканні

Напачатку, перад пасяджэннем Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, кіраўнікі дзяржаў правялі перагаворы ў вузкім складзе.

«Мы гатовыя да правядзення пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета, прапрацаваны парадак дня, пытанні ўзгоднены, прапануецца тры асноўныя пытанні абмеркаваць. Усе астатнія пытанні ў нас у поўнай гатоўнасці, прапануецца без абмеркавання прыняць», — адзначыў у пачатку перагавораў Аляксандр Лукашэнка.

Тры пытанні наступныя: аб Праграме ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2018—2019 гады, аб выкананні прыярытэтных напрамкаў і першачарговых задач далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву (2014—2017 гады) і далейшым развіцці Саюзнай дзяржавы на 2018—2022 гады. Апошняе пытанне датычылася ходу выканання рашэнняў ВДС Саюзнай дзяржавы.

Кіраўнік беларускай краіны павітаў расійскіх калег у сталіцы Беларусі. «Думаю, што гэтая сустрэча будзе плённай і мы здымем усе пытанні, якія, магчыма, не былі вырашаны на пасяджэнні саюзнага Саўміна», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за тое, што той узяў на сябе клопат арганізаваць сустрэчу ў Мінску. «Я ведаю, што вельмі шмат пытанняў сапраўды прапрацавана перш за ўсё на ўзроўні ўрадаў, ведамстваў. Калегі прасунуліся ў значнай ступені ў вырашэнні пытанняў, якія да гэтага часу яшчэ заставаліся нявырашанымі. Калі нешта засталося, то можам абмеркаваць», — дадаў Уладзімір Пуцін.

СТАР. 2




## КОРАТКА

- **Выстаўка «Блажэнная Валянціна, духоўная заступніца зямлі мінскай» адкрылася ўчора ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры».**



- Фестываль «Краіна марозіва» вырашыў заахвоціць усіх, хто ў паўсядзённым жыцці размаўляе на беларускай мове. Мінчанам прапаноўваюць з 19 па 21 чэрвеня расказаць пра свайго беларускамоўнага сябра і выказаць яму «рэспект» на сайце белыполюс.бел. За гэта сябра зробяць ганаровым госцем фестывалю і цэлы дзень будуць частаваць марожаным.
- **У Нясвіжы ваенныя пошукавікі знайшлі астанкі 650 ахвяр расстрэлу часоў Вялікай Айчыннай вайны.**
- Пад Слонімам відавочца і супрацоўнікі ДАІ Юрый Хільмановіч і Аляксандр Ярашэвіч выратавалі хлопчыка, які ўпаў у возера.
- **Самалёт Air China экстранна прызямліўся ў Нацыянальным аэрапорце, дапамогу МНС Беларусі не запрошвалі. Airbus A330 ляцеў з Барселоны ў Шанхай, прычына вымушанай пасадкі не называлася.**

■ Варта пераймання

# У ВЫЙГРЫШЫ АПЫНУЛІСЯ ЎСЕ

## У Пінску бізнесмен мяняе прыпыначныя навесы на новыя

**Памятаеце, як зусім нядаўна, у Год культуры, Пінск вызначыўся сваімі патрыятычнымі прыпынкамі? Тады, здаецца, толькі лянівы не напісаў пра цікавую сумесную акцыю прыватнага прадпрыемства і мясцовага аддзела ідэалогіі, калі аграмадныя партрэты класікаў беларускай літаратуры ўпрыгожылі аўтобусныя прыпынкі сталіцы Палесся.**

**І сапраўды, вельмі хораша глядзеліся плакаты з вывамі Максіма Багдановіча, Івана Шамякіна, Кандрата Крапівы. На іншым прыпынку з'явіліся партрэты Алаізы Пашкевіч і каралевы Боны з біяграфічнымі звесткамі пра названых асоб.**

Такая сацыяльная рэклама агенцтва «Аранжавы дэльфін» звярнула на сябе ўвагу грамадскасці і была станоўча ацэнена культурнай супольнасцю. Змест наглядный агітацыі час ад часу мяняецца, але справа патрыятычнага выхавання працягваецца. Зараз на прыпынку «Плошча Кірава» можна прачытаць пра музей Беларускага Палесся, што размешчаны ў будынку велічнага езуіцкага калегіума, экспазіцыі якога спаўняецца 90 гадоў. Ну і рознай рэкламнай інфармацыі там поўна.

СТАР. 5



ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ПА-БРАТЭРСКУ

## Праблемы — вырашаць

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што папярэдняе пасяджэнне ВДС, праведзенае амаль год таму, было вельмі прадукцыйным, дасягнутыя на ім дамоўленасці актывізавалі двухбаковае супрацоўніцтва ў многіх сферах.

Кіраўнік беларускай дзяржавы нагадаў, што ў 2017 годзе быў пераадолены працэс зніжэння ўзаемнага тавараабароту, бакі выйшлі на яго рост. Прэзідэнт Беларусі дадаў, што сёння важна замацаваць станоўчыя тэндэнцыі, забяспечыць далейшае нарошчванне гандлёвых адносін — у тым ліку за кошт ліквідацыі розных бар'ераў, а таксама стварэння роўнага канкурэнтнага асяроддзя.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што ў апошні час рашэнне актуальных пытанняў часта перакладаецца з аднаго інтэграцыйнага фармату на іншы — напрыклад, на пляцоўку Еўразійскага эканамічнага саюза. На думку беларускага лідара, нам не варта рабіць гэта надалей, таму што ў саюзе ў стане вырашаць тыя пытанні, якія існуюць, — калі нейкія праблемы перашкаджаюць узаемаадносінам дзвюх краін, то трэба іх вырашаць тут і цяпер.

Пры гэтым Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў: для знаходжання кансэнсусу няма чаго абмяркоўваць асобныя пытанні з краінамі, якія ў іх наогул не задзейнічаны.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на каардынацыйную ролю Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. «Яму трэба забяспечыць сістэмнае і рэгулярнае супрацоўніцтва профільных міністэрстваў і ведамстваў Беларусі і Расіі», — дадаў ён.

Беларускі лідар папрасіў дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоту максімальна глыбока ўнікаць у сутнасць і выразна бачыць баланс інтарэсаў бакоў па пытаннях, што абмяркоўваюцца на пляцоўцы Пастаяннага камітэта. «Тыдзень таму я аддаў распараджэнне ўраду, каб ні адны перагаворы не праходзілі без удзелу кіраўніка нашага апарату», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што знешнепалітычнае супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў носіць сістэмны і шматпланавы характар, Беларусь і Расія выступаюць з адзіных або блізкіх пазіцый па цэнтральных праблемах сучаснага свету, падтрымліваюць адна адну.

«Асаблівая тэма ў саюзным будаўніцтве — абарона інтарэсаў нашых грамадзян», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, для іх забяспечаны належны ўзровень правоў і свабоды. Зараз узнікаюць пытанні з нагоды перасячэння беларуска-расійскай мяжы — у найбліжэйшы час з гэтым аспектам будуць разбірацца.

Беларускі лідар падкрэсліў, што залогам поспеху нашай інтэграцыі застаюцца міжрэгіянальныя сувязі: гандлёва-эканамічныя адносіны з Беларуссю маюць 80 суб'ектаў Расіі, заключаны тры сотні дагавораў аб супрацоўніцтве на ўзроўні рэгіёнаў і муніцыпальных утварэнняў.

Ён нагадаў, што з 2014 года праводзяцца сумесныя форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі, пяты па ліку пройдзе ў кастрычніку гэтага года ў Магілёве, запрашэнне Уладзіміру Пуціну было адпраўлена.

Прэзідэнт Беларусі таксама дадаў, што адным з ключавых пунктаў парадку з'яўляецца зацвярджэнне прыярытэтных напрамкаў і першачарговых задач развіцця Саюзнай дзяржавы на наступныя пяць гадоў. Дакумент уключае ў сябе ўвесь спектр двухбаковага супрацоўніцтва, вызначае канкрэтныя мэты і інструменты іх дасягнення. У рэалізацыі гэтых напрамкаў павінны быць задзейнічаны ўсе органы кіравання Саюзнай дзяржавы, дадаў Аляксандр Лукашэнка.


Фота БелТА.
Міністры замежных спраў Беларусі і Расіі Уладзімір МАКЕЙ і Сяргей ЛАЎРОЎ.

## Супрацоўніцтва — у прыярытэце

«Хацеў бы ізноў падкрэсліць зацікаўленасць Расіі ў далейшым развіцці Саюзнай дзяржавы і нарошчванні палітычнай і эканамічнай інтэграцыі з Беларуссю, — заявіў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін. — У наступным годзе нашы краіны адзначаюць 20-годдзе падпісання Дагавора аб стварэнні саюза. За мінулы перыяд атрымалася шмат чаго дабіцца: нарасціць гандлёва-інвестыцыйныя, навукова-тэхналагічныя, культурныя, гуманітарныя сувязі, умацаваць дагаворна-прававую базу ва ўсіх сферах супрацоўніцтва».

Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што адно з ключавых пытанняў пасяджэння ВДС — зацвярджэнне прыярытэтных напрамкаў і першачарговых задач развіцця Саюзнай дзяржавы на 2018—2022 гады. «Гэты асноватворны дакумент вызначыць ключавыя арыенціры сумеснай працы на найбліжэйшыя пяць гадоў», — падкрэсліў Прэзідэнт Расіі.

Па словах кіраўніка Расійскай Федэрацыі, далейшага пашырэння і дыверсіфікацыі патрабуе ўнутрысаюзны гандаль. «У мінулым годзе тавараабарот павялічыўся амаль на чвэрць — плюс 23,5 % — і дасягнуў $32,4 млрд. У студзені — красавіку бягучага года дадалося яшчэ 18 %. Пры захаванні такой пазітыўнай дынамікі нам цалкам па сілах вывесці ўзаемны гандаль на ўзровень у $50 млрд», — упэўнены Уладзімір Пуцін.

Беларускія і расійскія кампаніі традыцыйна актыўна інвестуюць у саюзныя прадпрыемствы. «Лічым важным паступова паляпшаць дзелавы і інвестыцыйны клімат, праводзіць узгодненую фінансавую, грашова-крэдытную, падатковую палітыку», — лічыць кіраўнік расійскай дзяржавы. Ён таксама адзначыў супрацоўніцтва ў такіх сферах, як прамысловая кааперацыя, энергетыка, заклікаў развіваць навуковае, сацыяльна-гуманітарнае ўзаемадзеянне.

## Сказанае пацвердзілі

Па выніках сустрэчы прэзідэнты зрабілі заяву для СМІ і падсумавалі праведзеныя перагаворы. «Перш за ўсё хачу яшчэ раз цёпла павітаць Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна на беларускай зямлі. На сённяшнім пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы мы разгледзелі пытанні далейшага двухбаковага супрацоўніцтва, развіцця інтэграцыйных працэсаў і нарошчвання ўзаемадзеяння ў эканамічнай сферы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта Беларусі, праект Саюзнай дзяржавы з'яўляецца ўстойлівай платформай для ўмацавання беларуска-расійскіх адносін. Галоўная мэта яго застаецца нязменнай — паскарэнне тэмпаў сацыяльна-эканамічнага развіцця дзвюх дзяржаў і паляпшэнне жыцця нашых народаў.

«У мінулым годзе і на пачатку бягучага года мы выйшлі на стабільную траекторыю росту ўзаемнага тавараабароту. Нам неабходна забяспечыць далейшае нарошчванне гандлёвых адносін паміж дзвюма краінамі, у тым ліку за кошт стварэння роўнага канкурэнтнага асяроддзя, і мы гэтай тэме прысвяцілі наш асноўны час, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Важным элементам сённяшніх перагавораў стаў разгляд прыярытэтных напрамкаў развіцця Саюзнай дзяржавы на найбліжэйшае пяцігоддзе».

Адным з ключавых інструментаў дасягнення зафіксаваных у гэтым дакуменце мэт з'яўляецца павышэнне сістэмнага ўзаемадзеяння профільных арганізацый нашых краін. Гэта задача ўскладзена на Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы.

«Мы таксама казалі пра важнасць каардынацыі работы знешнепалітычных ведамстваў. Нашы краіны прытрымліваюцца адзіных пазіцый па асноўных сусветных праблемах і падтрымліваюць адна адну ў міжнародных арганізацыях. Так будзе заўжды, — упэўнены беларускі лідар. — Заахвочваю сваю важнасць рэалізацыя Праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2018—2019 гады. Мы і надалей будзем каардынаваць падыходы да праблем рэгіянальнай і агульнаеўрапейскай бяспекі, сумеснае процідзеянне новым выклікам і пагрозам».

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што спрэчныя пытанні, якія час ад часу ўзнікаюць у беларуска-расійскіх адносінах, традыцыйна будуць вырашацца ў духу ўзаемаразумення і кампрамісу, што ўжо ў прынцыпе нашы ведамствы робяць. «Гэта яшчэ раз было пацверджана і на маёй сустрэчы з Уладзімірам Уладзіміравічам, і непасрэдна ў ходзе мінулага пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета», — паведаміў беларускі лідар.

«Мы маем намер працягваць канструктыўны дыялог па ўсіх напрамках супрацоўніцтва. Для ўстойлівага развіцця нашых краін і павышэння ўзроўню дабрабыту народаў будзе задзейнічаны ўвесь патэнцыял Саюзнай дзяржавы. Перакананы, што ў нас сёння атрымалася надаць значны імпульс далейшаму ўмацаванню брацкага партнёрства Беларусі і Расіі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін падзякаваў беларускаму боку за цёплы прыём і пацвердзіў намеры Расіі і надалей развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
**Вераніка ПУСТАВІТ.**

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

# НА ШЛЯХУ ЗБЛІЖЭННЯ ЗАКАНАДАЎСТВА

**Сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, 54-я па ліку, прайшла ў Брэсце**

**Перад пленарным пасяджэннем парламентарыі з абедзвюх краін наведалі мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» і ўсклалі кветкі да Вечнага агню.**

У рабоце сесіі прынялі ўдзел дэпутаты Федэральнага сходу Расіі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Да ўдзелу былі запрошаны прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і пастаянныя назіральнікі пры Парламенцкім сходзе. Упершыню ў пасяджэнні сесіі ўдзельнічалі члены Маладзёжнай палаты Парламенцкага сходу, рашэнне аб стварэнні якой было прынята на папярэдняй сесіі.

На парадак дня было вынесена пытанне аб працэсе рэалізацыі рэкамендацый парламенцкіх слуханняў «Збліжэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па пытаннях роўных правоў грамадзян Саюзнай дзяржавы», якія прайшлі летась 16 снежня ў Бранску. Удзельнікі сесіі разгледзелі пытанне аб збліжэнні заканадаўства дзвюх краін у галіне забеспячэння роўных умоў гаспадарання, ход работы па рэалізацыі асноўных напрамкаў фарміравання і функцыянавання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы.

*Больш падрабязны матэрыял аб рабоце сесіі — у адным з наступных выпускаў «Саюз-Еўразія».*

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПРАЦЯГВАЕЦЦА МАДЭРНІЗАЦЫЯ ЯДЗЕРНАЙ ЗБРОІ

Многія дзяржавы, якія валодаюць ядзернай зброяй, скарачаючы яе запасы, распрацоўваюць новыя сістэмы ядзернай зброі і мадэрнізуюць ужо наяўныя, паведамляе Стакгольмскі міжнародны інстытут даследавання праблем міру. Па яго даных, на пачатак гэтага года ў распараджэнні дзевяці краін — ЗША, Расіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Кітая, Індыі, Пакістана, Ізраіля і Паўночнай Карэі — знаходзілася каля 14,5 тысячы ядзерных боегаловак. Гэта крыху менш у параўнанні з 2017 годам, на пачатак якога налічвалася амаль 15 тысяч адзінак. Са згаданай колькасці ядзернай зброі гэтага года аператыўнымі лічыліся прыблізна 3,75 тысячы адзінак, тлумачаць аналітыкі інстытута. Эксперты ўжо не першы год канстатуюць, што скарачэнне запасаў ядзернай зброі ідзе галоўным чынам за кошт далейшага змяншэння адпаведных арсеналаў ЗША і Расіі, на агульную долю якіх прыпадае каля 92 працэнтаў сусветных запасаў. У той жа час у гэтых краінах распрацаваны доўгатэрміновыя праграмы па далейшай мадэрнізацыі ядзерных зброевых сістэм.

## АБАМА НАДУМАЎ ВЯРНУЦЦА Ў ПАЛІТЫКУ

Колішні прэзідэнт ЗША Барак Абама можа вярнуцца ў палітыку і зноў вылучыцца ад Дэмакратычнай партыі на наступных прэзідэнцкіх выбарах у 2020 годзе. Пра гэта паведамляе часопіс Vanity fair. Адзначаецца, што ў апошнія некалькі месяцаў былы гаспадар Белага дома правёў сустрэчы з дзевяццю высокапастаўленымі прадстаўнікамі Дэмакратычнай партыі, у тым ліку з мэрамі Нью-Арлеана, Лос-Анджэлеса і Саўт-Бэнда, а таксама з адным з двух галоўных прэтэндэнтаў на ролю кандыдата ад Дэмакратычнай партыі на прэзідэнцкіх выбарах у ЗША ў 2016 годзе Берні Сандэрсам. Перагаворы з кожным з палітыкаў працягваліся больш за гадзіну. Палітычную актыўнасць Абамы ўжо заўважылі ў Кангрэсе, адзначае Politico.

## РЫМ ВЫРАШЫЛІ АЧЫСЦІЦЬ АД ЦЫГАН

Міністр унутраных спраў Італіі Матэа Сальвіні заявіў пра намер ачысціць Рым ад цыган без дакументаў. Яго словы перадае The Local. Па распараджэнні кіраўніка МУС у сталіцы праведуць перапіс цыган. «Нелегалаў мы выправадзілі па дамоўленасці з іншымі краінамі, а тых, якія з'яўляюцца італьянскімі грамадзянамі, на жаль, прыйдзецца пакінуць», — паскардзіўся ён. Сальвіні — лідар партыі «Ліга Поўначы», якая перамагла на парламенцкіх выбарах і падтрымлівае антыміграцкую палітыку. У маі «Ліга» заявіла пра намер знесці ўсе нелегальныя лагеры бежанцаў у італьянскай сталіцы, а таксама адабраць з сем'яў дзяцей, якія не наведваюць школу.

## ТРЫВУГОЛКА НАПАЛЕОНА ПРАДАДЗЕНА ЗА 350 ТЫС. ЕЎРА



Трывуголка, якую Напалеон Банапарт страціў падчас бітвы пры Ватэрлоа ў 1815 годзе, была прададзена на аўкцыёне ў Францыі за 350 тысяч еўра. Як пішуць заходнія выданні, пачатковы кошт экспаната складаў 30—40 тысяч еўра. Як паведамляе аўкцыённы дом De Baecque, трывуголку знайшлі пасля адступлення французаў пры Ватэрлоа. Яе адшукаў капітан галандскіх драгунаў Арну Ван Зейлен. Адзначаецца, што галаўны ўбор змяніў сем гаспадароў. Раней заснавальнік кампаніі Harim Group з Паўднёвай Карэі купіў трывуголку Напалеона за 1,4 мільёна еўра. Як вядома, Напалеон за час свайго кіравання насіў каля 120 галаўных убораў.

■ Сталічнае жыллё

# КВАТЭРЫ СЁЛЕТА Ў ЦАНЕ...

## За год жыллёвая нерухомасць у Мінску падаражэла на 22 %

**Па звестках Нацыянальнага кадастравага агенцтва, у маі было ўсяго 1000 дагавораў куплі-продажу. На куплю выдаткавалі 143 мільёны рублёў. Гэта значыць, у сярэднім кватэра каштавала 143 тысячы рублёў. У параўнанні з папярэднімі месяцамі адбыўся спад пакупніцкай цікавасці. У лютым, сакавіку і красавіку здзелак было на 14 % больш, чым у маі. Растлумачыць падзенне рынку можна і новымі правіламі выдачы крэдытаў. Цяпер ёсць жорсткае абмежаванне, калі на выплату працэнтаў і асноўнага доўгу ў вас павінна прыходзіцца не больш як 40 % ад прыбытку. Таму буйныя крэдыты сталі даступныя далёка не ўсім.**



Згаданыя абмежаванні па крэдытах быццам бы павінны весці да патанення жылля, але ў нас спецыялісты па нерухомасці прагназуюць яшчэ нязначнае падаражэнне па выніках года. У маі ў сталіцы працягваўся рост цэн на кватэры. Сярэдні кошт «квадрата» дасягнуў 2,5 тысячы рублёў, што на 8 % больш, чым у студзені, і на 22 % — чым у маі мінулага года. Падаражэнне адбываецца на фоне недастатковай прапановы першаснага жылля, а гэтая праблема не вырашаецца з прычыны дэфіцыту пляцовак пад забудову, гаворыць **ганаровы старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.**

Наш эксперт сцвярджае, што цэны на кватэры ў навабудоўлях падняліся, бо саміх дамоў становіцца менш. Ужо нават панэльнае жыллё прапануюць па 2400—2600 рублёў за квадратны метр. Вядома, павышэнне цэн на 22 % за год — гэта зашмат, досыць нечакана і амаль што нерэальна. Да чэрвеня намецілася стабілізацыя цэн, попыту і прапановы. Здзелак стала менш. У прынцыпе летам часцей за ўсё ў нас назіраецца зацішша. На думку Мікалая Прасталупава, да сярэдзіны жніўня змен на рынку не адбудзецца, а вось чаго чакаць далей...

У Мінску шмат жылля будавацца ўжо не будзе. Утворыцца дэфіцыт навабудоўляў, які і так ёсць. Аднапакаёвая кватэра за 100—120 тысяч рублёў без аздаблення — гэта няправільна, асабліва з улікам якасці будаўніцтва. У галоўным мегаполісе краіны штучна створаны дэфіцыт новабудоўляў. Зямлю ў горадзе не даюць, вакол кальцавой забудоўваць не жадаюць. За першасным будаўніцтвам расце і цана другаснага жылля. Каля 90 % прадаўцоў кватэр на другасным рынку ўзамен купляюць іншае жыллё, паляпшаюць жыллёвыя ўмовы. І ўсе хочуць новабудоўлі, а іх мала.

Нават калі прадаваць маленькую кватэрку ў старой панэльцы за 80 тысяч рублёў, то застаецца купіць больш прасторную новабудоўлю за 110 тысяч рублёў ды зверху ўкласці 20 тысяч у аздабленне. Варыянтаў палепшыць жыллёвыя ўмовы няшмат, лічыць Мікалай Прасталупаў. Але наш эксперт упэўнены, што пасля лета цэны відавочна не пойдуць уніз...

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Фінансавы выдатнік

# «ПЛЯЖНЫ» БРАНЗАЛЕТ-КАШАЛЁК

**І ў нас сталі выкарыстоўваць бескантактавыя банкаўскія плацежныя бранзалеты для хуткай і зручнай аплаты. Цяпер дастаткова прыкласці руку да тэрмінала, каб разлічыцца ў крамах, кафэ, рэстаранах, на АЗС або за праезд у метро. Пілотны праект рэалізаваў Пріорбанк сумесна з кампаніяй Visa.**

Бранзалет можна выкарыстоўваць у падарожжах — прыкладам можна аплачваць пакупкі як у Беларусі, так і за мяжой. Гаджэт не баіцца вады і перападаў тэмператур, так што яго можна смела браць на пляж, у аквапарк або трэнажорную залу.

Бранзалет змайстраваны досыць проста. У яго ўбудаваны памяншаны дублікат карткі з антэнай (міні-чып MiniTag), які мае ўсе функцыі бескантактавых картак Visa Classic payWave. Каб здзейсніць плацеж, трэба толькі паднесці бранзалет да плацежнага тэрмінала з падтрымкай бескантактавай тэхналогіі.

Пры аплаце рахункаў да 20 рублёў аперацыя праходзіць практычна імгненна — для яе пацвярджэння не патрабуецца ПІН-код. У выпадку буйной куплі плацеж трэба пацвердзіць, як і са звычайнай карткай. У якасці бонусу да бранзалета выдаецца банкаўская плацежная картка для ажыццяўлення аперацый у прыладах без падтрымкі бескантактавай аплаты.

Першымі навінку выпрабавалі супрацоўнікі адной прыватнай фірмы. Менавіта такім інавацыйным рашэннем банк павіншаваў IT-кампанію з 25-годдзем. «Пакуль бранзалеты ў вольны продаж паступаць не будуць. Але ў будучыні мы плануем зрабіць тэхналогію даступнай для ўсіх кліентаў, даўшы магчымасць хутка і зручна аплачваць тавары ці паслугі», — расказалі ў Пріорбанку.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Запрашальнік

# ДА ДНЯ ЛЕТНЯГА СОНЦАСТАЯННЯ

## Свята музыкі ў Нацыянальным гістарычным музеі

**21 чэрвеня ў 18 гадзін у дворыку Нацыянальнага гістарычнага музея адбудзецца канцэртная праграма ў рамках міжнароднай акцыі «Свята музыкі» (Fete de la Musique). Мерапрыемства арганізавана музеем сумесна з канцэртным агенцтвам «Эквілібрыум Артс» па ініцыятыве пасольства Францыі ў Беларусі і пры падтрымцы Міністэрства культуры.**

«Свята музыкі» (Fete de la Musique) — штогадовая музычная акцыя, якая праходзіць ва ўсім свеце 21 чэрвеня і прымеркавана да Дня летняга сонцастаяння. Упершыню яна прайшла ў 1981 годзе ў Францыі. З часам свята набірала абароты і да цяперашняга моманту стала значнай міжнароднай арт-падзеяй. Сёння больш за 100 дзяржаў і 340 гарадоў па ўсім свеце кожны год праводзяць жывыя выступленні ў рамках «Свята музыкі». У гэтым годзе Беларусь упершыню далучаецца да такой міжнароднай акцыі.

«Свята музыкі» — выдатная нагода пазнаёміцца з разнастайнасцю музычных жанраў, прадстаўленых у Беларусі і ў Францыі. Стылявая скіраванасць мінскага «Fete de la Musique» будзе шматжанравай.

У гэты дзень музей парадуе наведвальнікаў не толькі магчымасцю пазнаёміцца з яго экспазіцыямі, але і паслухаць музыку ў залах — ужо з першых хвілін адкрыцця.

Апагеем музычнага дня стане канцэрт у дворыку галоўнага будынка музея. З 18 да 23 гадзін перад гасцямі свята выступяць самыя розныя артысты. Гэта Аня Жданава (інды-поп/электроніка) — уладальніца прэміі «Найлепшы электронны альбом» 2017 года, паводле версіі сайта experty.by. Таксама Malanka Orchestra (поп-фолк) — беларускі музычны гурт, які выконвае музыку ў розных стылях — ад ска да gypsy-твіста. Можна будзе пачуць Re1ikt (мадэрн-рок) — гурт-пераможцу ў намінацыі «Найлепшы рок-альбом» за дыск «Лекавыя травы» ў 2015 годзе, паводле версіі сайта experty.by. Яшчэ адзін яскравы ўдзельнік — Nizkiz (поп-рок). Гэты гурт выступаў на многіх музычных фестывалях, іх сінгл «Небяспечна» стаў галоўным хітом 2017 года, паводле версіі музычнага партала Tuzin.fm.

Аматараў вынаходлівай музыкі і вытанчанага гучання пацешаць спецыяльна запрошаныя з Францыі артысты: Patricia Bonner (вакал), Jean-Michel Proust (саксафон), якія прадставяць сумесную праграму з добра вядомым у Беларусі і за яе межамі трыа Канстанціна Гарачага.

Кошт білетаў — 5 BYN, для школьнікаў, пенсіянераў, студэнтаў — 3 BYN.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# НАША МОВА ПАВІННА БЫЦЬ УСЮДЫ!

**З гамяльчанкай Святланай МАЛЕЦ мы пазнаёміліся падчас правядзення дня падпісчыка ў аддзяленні № 50 Гомеля. Праўда, высветлілася, што падпіску на «Звязду» жанчына аформіла загадзя, але ж падышла, каб пагутарыць. І на пытанне, чаму вы выбіраеце «Звязду», адказала: «Гэта ж наша нацыянальная газета — адзіная на беларускай мове!»**

Колькі гадоў запар з'яўляецца падпісчыцай, жанчына нават не можа дакладна ўспомніць. Ці то 30, ці то больш, кажа. Пры гэтым вельмі шкадуе, што не вучыла некалі беларускую мову ў школе:

— Мае бацькі мяне ад беларускай мовы вызвалілі — як многіх у той час. Стала цікавіцца ёю значна пазней. Колькі падарожнічала па свеце, паўсюль бачыла: усе ганарацца сваёй роднай мовай. А наша ж мова прыгажэйшая за італьянскую! Мне здаецца, яна павінна быць больш чутна ўсюды.

Сёння Святлана Канстанцінаўна пенсіянерка, а працавала ўсё жыццё інжынерам: доўгі час на гомельскім фанера-запалкавым камбінаце, перад пенсіяй — у гандлёвым доме «Малочныя карункі»:

— Я заўсёды параўноўваю інфармацыю ў розных крыніцах, у тым ліку чытаю палітычныя агляды «Звязды». Мне цікавыя публікацыі Захара Бурака ў рубрыцы «Кантыненты». Заўсёды важна даведвацца пра сітуацыю ў розных краінах свету. «Хатнюю энцыклапедыю» чытаю і нават нешта для сябе пакідаю. Было б добра, калі б вы напісалі, што азначаюць узоры на вышыванках. Тым больш што яны маюць асаблівасці ў розных рэгіёнах краіны.

Мы са свайго боку падарылі Святлане Канстанцінаўне сувеніры ад «Звязды».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

## Чырвоная картка прынесла Японіі перамогу

Учора на чэмпіянаце свету ўпершыню здарылася яшчэ адна гульнявая падзея. Першую чырвоную картку на мундзіялі ў Расіі атрымаў паўабаронца зборнай Калумбіі Карлас Санчэс. У пачатку гульні з Японіяй (група H) ён у штрафной адбіў рукой мяч, які ляцеў у вароты яго каманды. Пакаранне было хуткім і суровым — Санчэс накіраваўся глядзець футбол па тэлевізары, а Сіндзі Кагава забіў гол з прызначанага 11-метровага.



Фота rsport.ria.ru.

Варта адзначыць, што калумбійцы не апусцілі рукі, а наколькі хапала сіл намагаліся адыграцца, і гэта ў іх атрымалася. У канцы першага тайма Хуана Кінтэра даволі хітра выканаў штрафны ўдар, падмануўшы і сценку, і японскага галкіпера, які зловіў мяч ужо за лініяй варот, але ўпарта даказваў суддзі, што ён не дапусціў гола. Мабыць, пра сістэму відэапаўтораў забыўся.

У другім тайме каманда Японіі вельмі старалася пераўтварыць сваю колькасную перавагу ў забітыя мячы, і адзін раз у іх гэта атрымалася — на 73-й хвіліне пасля вуглавога вызначыўся Юя Асака. Калумбія вельмі хацела адыграцца, нават у меншасці крыху прыціснула японцаў да іх варот, але да гола справа не дайшла. А вось зборная Японіі парадавала першай перамогай прынцэсу сваёй краіны Хісака Такамада, якая прысутнічала на матчы, ну і, зразумела, усіх сваіх суайчыннікаў.

І другі матч групы H таксама прынёс не такую, як у мексіканцаў з чэмпіёнамі свету, але ўсё ж сенсацыю — каманда Сенегала абыграла зборную Польшчы з лікам 2:1. Першым здарыўся аўтагол польскага гульца Цьяга Чонека, падвоіў перавагу афрыканцаў М'Бае Ньянг, гол на карысць Польшчы забіў Гжэгаж Крыхавяк.

**Іван КУПАРВАС.**

■ На слыху

# «Еўрабачанне» могуць перанесці ў Аўстрыю?

**Выданне ESCToday са спасылкай на Еўрапейскі вяшчальны саюз паведаміла, што Ізраіль можа быць пазбаўлены права праводзіць налета міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне». Арганізатары асцерагаюцца «празмернай палітызацыі» музычнага шоу, байкоту з боку многіх удзельнікаў і абвастрэння араба-ізраільскага канфлікту.**

Па звестках еўрапейскіх СМІ, сярод прадзюсараў конкурсу вядуцца размовы аб пераносе мерапрыемства ў Аўстрыю. Раней міністр культуры Ізраіля Міры Рэгеў патрабавала ад вяшчальнікаў строгага ўзгаднення з урадам праграмы падрыхтоўкі «Еўрабачання» і настойвала, што калі выдаткі на конкурс фінансуе дзяржава, то песенны форум мусіць прайсці ў Іерусаліме ці больш нідзе. Аднак пазней было абвешчана, што на «Еўрабачанне-2019», акрамя непрызнанай сталіцы Ізраіля, прэтэндуюць яшчэ некалькі гарадоў. Канчатковае рашэнне аб тым, дзе ўсё ж адбудзецца конкурс, Еўрапейскі вяшчальны саюз агучыць не пазней за верасень гэтага года.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Ініцыятыва

# УСЕ СВАЕ Ў КАВЯРНІ

## Афіцыянтаў навучаць абслугоўваць людзей з інваліднасцю

**Безбар'ернае асяроддзе — гэта не толькі пандусы і ліфты, але і гатоўнасць установ абслужыць любога чалавека. Каб навучыць персанал працаваць з кліентамі з інваліднасцю, у краіне будуць праводзіць спецыяльныя курсы.**

Ідэя праекта «Усе свае ў кавярні» з'явілася пасля поста ў «Фэйсбуку».

— Мая сяброўка, у якой сын з аўтызмам, напісала, што хоча схадзіць у кавярню з дзіцем, але баіцца, што рэакцыя персаналу будзе не такой, як хацелася б: іх могуць не зразумець ці ўвогуле папрасіць сысці. І дадала, што было б добра, калі б хтосьці навучыў афіцыянтаў, як з такімі людзьмі правільна сябе паводзіць, — расказвае **адна з аўтараў праекта Наталля ФУРСАВА.**

Попыт на трэнінг быў і з боку устаноў.

— Мы шчыльна працуем з адным з буйных мінскіх гатэляў, — дзеліцца **сааўтар праекта і спецыяліст Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам Тацяна ГРЫШАН.** — Часам у персаналу ўзнікаюць цяжкасці пры абслугоўванні людзей з інваліднасцю. Па просьбе гатэля нашы спецыялісты некалькі разоў праводзілі спецыяльныя семінары. Але гэтага недастаткова — патрэбны паўнацэнны курс.

Памылак у абслугоўванні сапраўды хапае. Так, у некаторых установах, калі ў дзвярах бачаць кліента ў калясцы, часта адразу ўсе кідаюцца дапамагаць. Але праз залішнюю мітусню наведвальнік адчувае сябе яшчэ больш няёмка. Ці, бывае, адміністрацыя ўстановы стараецца максімальна перастрахавацца, каб не несці адказнасць. Напрыклад, просіць напісаць ліст, што калі чалавек з інваліднасцю ўпадзе з слізкай пліткі і пакалечыцца, то не будзе прад'яўляць да ўстановы ніякіх прэтэнзій.

У лютым сацсеткі абляцела гісторыя, як Міс свету на калясцы Аляксандру Чычыкаву не пусцілі з сябрамі ў адзін з мінскіх бараў. Адміністрацыя палічыла, што дзяўчыне будзе там небяспечна.

— Гэта псеўдаклопат, а не павага да чалавека. Ён сам нясе за сябе адказнасць і вырашае, куды пайсці, — лічыць Тацяна Грышан.

Трэнінг для персаналу будзе складацца з пяці заняткаў па розных тэмах. Падчас іх раскажуць, як прыняць у кавярні чалавека з парушэннямі слыху, слабадушчага, на калясцы ці з інтэлектуальнымі парушэннямі, а таксама зрабіць інфармацыю ва ўстанове даступнай. Добра, каб наведвальнік мог самастойна прачытаць меню, паказальныя таблічкі. На кожны занятак адводзіцца акадэмічная гадзіна. Праводзіць трэнінг ці не, кожная кавярня вырашае самастойна.

— Мы будзем даваць больш практыкі. Напрыклад, разбіраць сітуацыі паводзін. Вось уявіце: стаіць чалавек з інтэлектуальнымі парушэннямі і круціцца, хістае галавой. Людзі часам пужаюцца. А ён так расслабляецца. Трэба персаналу растлумачыць такія паводзіны, каб яны ведалі, што гэтаму чалавеку не дрэнна, ён нікому не зробіць шкоды, — заўважае Тацяна Грышан.

— Будзем прыносіць на заняткі спецыяльныя акуляры, інвалідную каляску, бярушы, каб паглыбіць у сітуацыі. Калі афіцыянт адчуе сябе на месцы кліента, яму прасцей будзе знайсці варыянт, як абслужыць такога наведвальніка, — дадае Наталля Фурсава.

Нюансаў шмат. Чалавеку на калясцы важна казаць не «паехалі», а «пойдзем». Калі ён з суправаджальнікам, будзе памылкай звяртацца толькі да другога (часта калясачніка не ўспрымаюць як самастойную адзінку і вядуць размову так, быццам яго няма).

Калі ў чалавека стаіць слыхавы апарат, гэта не значыць, што ён выдатна вас чуе. А таму пры размове неабходна глядзець яму ў вочы, а не вазіцца ў паперках. Гаварыць трэба выразна, не спяшаючыся — многія людзі з парушаным слыхам чытаюць па вуснах. Аўтары праекта ўспамінаюць, як у кавярні Аўстраліі загадалі ўсім афіцыянтам вывучыць мову жэстаў, пасля таго як там не змаглі абслужыць кліента, які не чуе. І папярэджваюць: задача іх трэнінгу не ў гэтым. Не трэба ўпадаць у крайнасці — існуюць і іншыя спосабы зразумець чалавека, які не размаўляе. Ён можа напісаць сваю просьбу ці набраць на тэлефоне.

Пасля трэнінгаў для работнікаў хочуць рабіць невялікія стажыроўкі. Тыя ўстановы, дзе персанал пройдзе курсы, будуць пазначаны спецыяльнымі налепкамі. Інфармацыю пра такія кавярні можна будзе знайсці і на анлайн-карце.

Кавярні — гэта толькі першы крок. У планах ахапіць такімі трэнінгамі ўсю сферу абслугоўвання: гатэлі, банкі, крамы, бібліятэкі. Аўтары праекта спадзяюцца, што курс увойдзе ў спіс абавязковых, неабходных для пацвярджэння якасці персаналу.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**



■ Сацыяльны сектар

# РАННЯЕ ЎМЯШАННЕ ПАЛЯПШАЕ ПРАГНОЗЫ

## У сям'і нашмат больш магчымасцяў дапамагчы асабліваму дзіцяці, чым у прафесіяналаў

**Нараджэнне дзіцяці — заўсёды велізарная радасць. Нават калі яно нарадзілася не зусім здаровае. А такое, на жаль, здараецца ўсё часцей. Першасная інваліднасць сярод дзяцей да 18 гадоў у Беларусі за апошнія 10 гадоў вырасла на 25 % і летась склала 21,06 на 10 тысяч дзяцей. Спецыялісты кажуць, што першыя тры гады ў жыцці дзіцяці — самыя важныя. Асабліва гэта датычыцца дзяцей з асаблівасцямі развіцця: калі выявіць інваліднасць у першыя 1000 дзён, можна значна паменшыць яе негатыўныя наступствы.**

Штогод у паслугах ранняга ўмяшання ў нас маюць патрэбу каля 15 тысяч дзяцей малодшага ўзросту.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Аб тым, як палепшыць жыццё дзяцей з інваліднасцю, ішла размова падчас рэгіянальнай канферэнцыі краін Еўропы і Цэнтральнай Азіі «Ранняе ўмяшанне для дзяцей: умацаванне сістэм і пашырэнне правоў і магчымасцяў сем'яў», якая праходзіла ў Мінску 5-6 чэрвеня.

Міністэрства аховы здароўя Беларусі агучыла інфармацыю, паводле якой штогод у паслугах ранняга ўмяшання ў нас маюць патрэбу каля 15 тысяч дзяцей малодшага ўзросту. У нейкім сэнсе прычынай колькаснага росту стала ўдасканаленне ўзроўню аказання дапамогі маці і дзецям — пры родах сёння выжывае больш немаўлят. Але, натуральна, яны застаюцца з праблемамі, таму і маем прырост дзіцячай інваліднасці. Хоць, як кажуць медыкі, на гэтыя праблемы са здароўем можна рэальна паўплываць, з імі можна і трэба працаваць. На такіх малых і арыентавана мадэль ранняга ўмяшання — каб вырасціць здаровых і паўнавартасных членаў грамадства.

Адно з ключавых пытанняў — гэта правядзенне скрынінгу і як мага больш ранняе выяўленне дзяцей з парушэннямі ў развіцці. У цэнтры абмеркавання спецыялістаў знаходзілася таксама праблема забеспячэння паўнавартаснай падтрымкі ад прафесійна падрыхтаваных спецыялістаў усім без выключэння сем'ям, якія маюць дзяцей з інваліднасцю. Эксперты з розных краін гаварылі і пра тое, як забяспечыць дзяцей малодшага ўзросту, у якіх ёсць парушэнні ў развіцці, неабходнай падтрымкай да і падчас іх знаходжання ў дашкольных установах, а таксама падтрымкай пры пераходзе да базавай адукацыі, каб прадухіліць іх змяшчэнне ў інтэрнатныя ўстановы.

— Існуе шмат розных падыходаў да аказання паслуг па ранім умяшанні, — гаворыць **доктар Ганна-Марыя СЕРАНА, прэзідэнт Еўрапейскай асацыяцыі ранняга ўмяшання для дзяцей, член праўлення Нацыянальнай асацыяцыі ранняга ўмяшання Партугаліі.** — Але ёсць агульныя прынцыпы, якія мы адстойваем. Яны могуць быць ужытыя ў любой краіне, у тым ліку і ў Беларусі. Вельмі важна праводзіць скрынінг і як мага раней выяўляць малых з асаблівасцямі. Таксама ўсе дзеці, у тым ліку і з праблемамі развіцця, павінны знаходзіцца ў натуральным асяроддзі, іх нельга аддзяляць ад сваіх бацькоў і сем'яў, змяшчаць у дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы. І самае галоўнае — у цэнтры ўсёй работы павінна быць сям'я. Трэба паважаць яе патрэбы, яе спецыфіку, лад жыцця і жаданне бацькоў выхоўваць дзіця тым або іншым чынам.

Як заявіў **галоўны спецыяліст па дзіцячай рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аляксандр ЯКАЎЛЕЎ**, у нас сістэма ранняга ўмяшання пачала развівацца ў 2001 годзе. У нашай краіне выкарыстоўваюцца традыцыйныя класічныя падыходы да гэтай праблемы. Пры гэтым, па словах Аляксандра Якаўлева, часта сям'я знаходзіцца ў ролі пабочнага назіральніка і толькі ацэньвае дзеянні спецыялістаў у адносінах да іх дзіцяці. Але толькі пры актыўным удзеле сям'і можа эфектыўна ажыццяўляцца дапамога, упэўнены беларускі рэабілітолаг.

**У Беларусі на 1 мая 2018 года зарэгістравана 31 471 дзіця з асаблівасцямі ў развіцці. Дзеці з асаблівасцямі ў развіцці складаюць 48 % ад тых, якія знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах.**

З ім згодны **доктар Манфрэд ПРЭЦІС, прафесар па міждысцыплінарным ранім умяшанні пры медуніверсітэце Гамбурга.** «Мы гаворым аб комплексным падыходзе, каардынаванай сістэме падтрымкі дзіцяці, якая пачынаецца яшчэ з радзільнага аддзялення, працягваецца праз педыятраў і заканчваецца сацыяльнай інклюзіяй. Сацыяльны сектар мае найважнейшую ролю», — кажа Манфрэд Прэціс. — Але ў сям'і нашмат больш магчымасцяў, чым у прафесіяналаў. Таму вельмі важна стымуляваць развіццё дзяцей на ўзроўні сям'і. Бацькам у першую чаргу патрэбна інфармацыя, для таго каб яны адчувалі сябе здольнымі нешта зрабіць дома для свайго дзіцяці. Калі сям'я ўцягнутая ў гэтую працу, калі маюцца надомныя праграмы развіцця дзіцяці, у якіх удзельнічаюць бацькі, бабулі-дзядулі, браты і сёстры, у такім выпадку эфект працы будзе нашмат вышэйшы». Таксама і **Дзіпа ГРОВЕР, старшы рэгіянальны саветнік па ранім развіцці дзяцей Рэгіянальнага аддзялення ЮНІСЕФ для Еўропы і Цэнтральнай Азіі,** адзначыла, што прыйшла пара змяніць пункт гледжання і адыйсці ад тэмы недахопаў і абмежаванняў, каб паставіць у цэнтр увагі сям'ю і яе моцныя бакі.

**Рэгіянальная канферэнцыя «Ранняе ўмяшанне для дзяцей: умацаванне сістэм і пашырэнне правоў і магчымасцяў сем'яў» прайшла пад эгідай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь у партнёрстве з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ). У ёй прынялі ўдзел выдатныя міжнародныя эксперты, спецыялісты па ранім умяшанні з больш чым 15 краін, у тым ліку з Аўстрыі, Партугаліі, Грузіі, Украіны, Балгарыі, Беларусі і Расіі, а таксама бацькі і прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый.**

**Святлана БУСЬКО**

# У ВЫЙГРЫШЫ АПЫНУЛІСЯ ЎСЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Кіраўнік названага агенцтва, прадпрымальнік Уладзімір ЖЫЛЮК** расказвае, што са сваёй ініцыятывай наконт добраўпарадкавання прыпынкаў звярнуўся ў гарвыканкам крыху больш за тры гады таму. Прапанаваў за свае сродкі правесці замену канструкцый прыпынкаў, правільней сказаць, іх навесаў. Раней яны былі розныя па стылі, архітэктурным рашэнні, а дзе-нідзе наогул выглядалі не найлепшым чынам.

— Сваю ідэю мы афармілі дакументальна, падрабязна ўзгаднялі ўсё з архітэктурай, транспартнікамі, іншымі ведамствамі і дасягнулі разумення, — расказвае Уладзімір Міхайлавіч. — Мы паабяцалі зрабіць прыпынкі сучаснымі, набліжанымі да еўрапейскага стылю па знешнім выглядзе і зручнымі для пасажыраў. Такім чынам, гэта стала выгадна для горада прапановай, бо бюджэту не давялося траціць грошы на абнаўленне прыпынкаў. Выгадна, несумненна, і нам, бо агенцтва атрымала магчымасць размяшчаць рэкламу ў месцах масавага знаходжання людзей.

— У 2015 годзе мы зманціравалі першы пробны прыпынак на вуліцы Цэнтральнай, — працягвае суразмоўнік. — Ён стаў свайго роду прэзентацыяй нашай ідэі. Атрымалі адабрэнне як грамадзян, так і зацікаўленых арганізацый, і сталі рухацца далей. Следам быў прыпынак на плошчы Кірава, на якім распачынаўся названы культурны праект. І вось ужо сёння ўстанаўліваем канструкцыю 28-га па ліку прыпынку. Усе яны выглядаюць сучасна, зробленыя ў адзіным стылі. У наступныя два-тры гады плануем уладкаваць яшчэ столькі ж навесаў.

Уладзімір Міхайлавіч запрашае на сваю вытворчую базу па вуліцы Інтэрнацыянальнай, дзе чакае спецыялізаванага транспарту гатовы да ўстаноўкі каркас новага прыпыначнага пункта.

На прадпрыемстве растлумачылі: каркас зроблены з антывандальнага матэрыялу. Дарэчы, пра вандалаў. Агенцтва адразу застрахавала свае канструкцыі, каб у выпадку якіх здарэнняў атрымліваць грашовую кампенсацыю на


Адзін з новых прыпынкаў.

рамонт. Але падобныя выпадкі тут называюць адзінкавымі. У асноўным гараджане ставяцца з разуменнем да грамадскай маёмасці.

— Раз на тыдзень наш супрацоўнік аб'язджае ўсе прыпынкі, аглядае іх. Калі ёсць якія-небудзь дробныя пашкоджанні, яны абавязкова выпраўляюцца. Мы сочым нават за станам стэндаў з раскладам руху аўтобусаў, хоць гэта і не наша маёмасць. Але калі там нешта не так, напрыклад, расклад папсавалі альбо да яго прыляпілі папяровую аб'яву з адрыўнымі тэлефонамі, паведамляем у аўтапарк, і яны прымаюць меры. Мы даглядаем прыпынкі, бо ўзяліся за іх адказваць. За зямлю, на якіх прыпыначныя паветкі размяшчаюцца, плацім арэндную плату. І ўсё роўна гэта выгадна, значыць, будзем працягваць займацца абнаўленнем згаданай гаспадаркі, — падсумоўвае кіраўнік «Аранжавага дэльфіна».

Надалей бізнесмен думае, як развіваць прыпыначны сэрвіс. Маецца на ўвазе, напрыклад, уладкаванне ўстройства для зарадкі батарэй тэлефонаў, акумулятараў, як гэта зроблена за мяжой. «Цяпер жа людзі жывуць з тэлефонам, зараз там размяшчаецца ўсё — і медыцынская карта, і банкаўскія рахункі, і ўсе асабістыя камунікацыі. А як толькі гэты апарат пазбаўляецца энергіі, чалавек становіцца як без рук. І магчымасць папоўніць энергію свайго смартфона — прыкмета цывілізацыі» — разважае пінскі прадпрымальнік і дэпутат гарадскога Савета. Дарэчы, як лічыць сам народны абраннік, падтрымцы выбаршчыкаў ён у многім абавязаны новым прыпынкам і акцыям, якія тут праводзіліся.

**Старшыня Пінскага гарвыканкама Андрэй МУЛЯРЧЫК** расказаў карэспандэнту газеты, што ў выпадку з кампаніяй па абнаўленні прыпыначных навесаў прыватная ініцыятыва аб'ядналася з дзяржаўнай падтрымкай, у выйгрышы апынуліся ўсе. І запэўніў, што падобныя прапановы і падыходы будуць і надалей вітацца гарвыканкамам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*г. Пінск.*

■ Местачковыя святы

# Начныя прыгоды з Баламутнем



**Здарыліся на выхадных у аграгарадку Краснае непадалёк ад Карэліч. Туды ў водпуск прыехаў міфалагічны беларускі вадзяны цар — халасцяк-гарэза Баламуцень, каб адпачыць ды пажартаваць з мясцовымі. А тыя не разгубіліся і не толькі як след прынялі дарагога госця, а і паказалі, якія яны рыбаловы, спартсмены і проста жвавыя ды ахвотныя да вяселля людзі.**

У Карэліцкім раёне шмат прыгожых азёраў, таму не дзіва, што адно з іх выбраў для адпачынку Баламуцень. Ды толькі не ведаў, што ваду ў ім зачаравала пачвара, бо надта часта людзі па яго берагах гуляюць, ім з лесуном жыць замінаюць. Толькі пакупаўся Баламуцень — выраслі ў яго рогі. Загараваў жартаўнік. Як на вочы жанчынам паказацца, да якіх ён вялікі ахвотнік, як іх зачароўваць? Лясун яго грыбамі карміў — не дапамагло. Разважалі нават, ці не спілаваць іх, ды ў пару адумаліся. Нарэшце верныя русалкі ўгаварылі-такі пачвару пазбавіць Баламутня рагоў.

Гэтую вясёлую і яркую тэатралізаваную пастаноўку для гасцей падрыхтавалі супрацоўнікі мясцовага аддзела культуры.

— Такое свята мы арганізавалі сёлета ўпершыню. Вельмі хацелася не проста дзень рыбака адзначыць, а знайсці нешта сваё, адметнае. Кажуць, у нашым возеры Баламутня бачылі, вось мы яго да сябе і запрасілі, — смяецца **Алеся СТРУК, загадчыца аддзела культуры і вольнага часу «Красненскі дом культуры».** — Калі гледачам спадабаецца, то працягнем такое рабіць штогод, будзем удасканальваць творчую частку, дадаваць тэатральнасці і відовішчнасці.

Пасля міні-спектакля Баламуцень адправіўся шукаць сабе дзяўчыну, якую, кажуць, ён назаўжды не забірае, а праз нейкі час адпускае назад, да людзей. Затое яна ўжо ніколі ў жыцці не патоне. Асаблівым попытам карысталіся ў цара тыя, хто вытрымаў неабавязковы, але пажаданы дрэс-код свята і прыйшоў у чырвоным.

Госці спачатку добра патанчылі на канцэрце, што давалі артысты з Іўеўскага дома культуры, а пасля скіраваліся шукаць заняткі па інтарэсах.




Вось у «Рэстаране на кручку» з'явіліся першыя наведвальнікі, мясцовыя жыхары Анатоль і Мікалай, якія, пачаставаўшыся сушанай рыбай ды квасам за сімвалічную плату (рубель), задаволена казалі: «О, каб такое кожны дзень — добра б было». А работнікі культуры ў цыляняшках частавалі юшкай і смажанай на мангале рыбай. Смаката! Сама каштавала.

Ну, а як жа пасля хлеба і відовішчаў не паказаць сябе, не паспаборнічаць? Мясцовыя рыбакі праявілі спрыт, ловячы рыбу з басейна голымі рукамі. Пасля яны сышліся ў кулінарным паядынку, на хуткасць чысцілі рыбу ды гатавалі яе на мангале. Затым надышоў час спартыўнага майстэрства: перацягванне каната ды ўздыманне гір.

Самым маленькім таксама было чым заняцца, таму на свята некаторыя прыходзілі не проста ўсёй сям'ёй, а трыма пакаленнямі:

— Прыехаў на выхадныя дадому да бацькоў, як заўжды, а мама кажа, што ў нас свята такое. Узяў яе з татам, жонку з сынам і прыйшлі. Не пашкадавалі. Надвор'е цудоўнае,




і забаў на любы густ. Хто танцуе, хто на батуце скача, хто юшку сёрбае, і ўсе задаволеныя, — разважае **Андрэй НАПОРКА,** мясцовы жыхар у дзяцінстве, а цяпер выкладчык Беларускага дзяржаўнага аграрнатэхнічнага ўніверсітэта.

Адпачынак ды гульні цягнуліся ледзьве не дацямна. А тыя, у каго засталіся сілы, скакалі да гадзіны ночы на начной дыскатэцы.

**Ірына СІДАРОК** ■

## «Агонь танца» і рыцары

**Маладзёжны фестываль субкультур пройдзе ў сталіцы**

**23 чэрвеня з 14.30 да 22.30 пройдзе пяты фестываль маладзёжных субкультур «Мінск — сталіца моладзі», арганізатарам якога выступаюць Мінскі гарадскі камітэт БРСМ і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт (паляна масавых мерапрыемстваў парку Перамогі).**

Старт фестывалю дасць конкурс «Агонь танца». Журы вызначыць па выніках выступлення найлепшыя калектывы сталіцы ў намінацыях «Брэйк-данс», «Стрыт-дэнс», «Спартыўная лаціна», «Усходні танец», «Беларускі народны танец», «Нацыянальны танец», а таксама «Шоу-праграма».

Мінчане і госці сталіцы змогуць прыняць удзел у рабоце інтэрактыўных пляцовак маладзёжных субкультур: вулічных музыкаў, стрыт-арту, паўдзельнічаць у майстар-класе па футбольным фрыстайле і Challenge-марафоне, даведацца сакрэты ілюзіяніста, пабачыць рыцарскія баі. Кожны зможа праявіць сябе ў танцавальных батлах і нават паркуры. На пляцоўцы «BRSMVLOG» адбудецца прэзентацыя праекта «#BRSMLIFE».

Перавесці дух дапаможа насычаная творчая праграма, а хэдлайнер фестывалю, імя якога стане вядомае ўжо ў суботу, падорыць буру эмоцый і запальны настрой. Завершыць маладзёжны фестываль «Бітва DJ».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Лёсы ў гісторыі

# НАВУЧЫЦЬ ГАЛОЎНАМУ
## на мове мудрацоў і філосафаў

**Мая РАКАЎСКЕНЕ нарадзілася і жыве ў Барысаве. Усё сваё жыццё яна прысвяціла адукацыі: спачатку выкладала ў пачатковых класах, а цяпер (у свае 82 гады) вось ужо больш як дзесяць гадоў працуе рэпетытарам-валанцёрам у сям'і, дзе выхоўваюцца прыёмныя дзеці.**



***— Мая Васілеўна, вы сталі сведкай рэформаў у адукацыі, якія адбываліся на працягу больш як паўстагоддзя...***

— Я была не проста сведкай, а чалавекам, які ўвасабляў рэфарматарскія задумкі. Напрыклад, прыняла актыўны ўдзел у рэформе 1960-х гадоў. У той час я працавала ў самай прэстыжнай барысаўскай школе № 6, дзе вучыліся дзеці гарадской адміністрацыі і інтэлігенцыі. Курыраваў пачатковыя класы гэтай установы адукацыі заслужаны настаўнік БССР Васіль Андрэевіч Самцэвіч. Найвышэйшае кіраўніцтва прапанавала эксперыментальную праграму, каб паглядзець, як іх ідэя ўвасобіцца на практыцы: мы павінны былі чатырохгадовую праграму выкласці за тры гады. На здзіўленне, усе мае вучні засвоілі вучэбны матэрыял. Лічу, што гэта быў добры вопыт, які так і не пабачыў свет у поўным маштабе.

Задума наступнай рэформы заключалася ў дыферэнцыяцыі навучэнцаў. Былі адкрыты школы для дзяцей з запаволеным развіццём. Вучняў у такіх класах было менш (каля дваццаці), але там ніхто не дапамагаў адно аднаму з-за таго, што ў калектыве не было больш моцных школьнікаў, якія маглі б павесці за сабой, дапамагчы і падтрымаць. Мяркую, што і настаўнікі не атрымлівалі задавальнення ад працы па прычыне адсутнасці цікавасці да вучобы з боку дзяцей. Але ў той жа час класы, адкуль забралі слабых вучняў («непаўнавартасных», на думку некаторых чыноўнікаў), не сталі лідарамі па паспяховасці. Да ўсяго гэтага другагодніцтва было амаль забаронена і педагогаў вінавацілі ў дрэннай паспяховасці іх вучняў.

***— А адкуль узялася такая вялікая колькасць дзяцей з запаволеным псіхічным развіццём?***

— Насамрэч не было нейкага адставання ў развіцці. Проста дзяцінства ў гэтых малых заканчвалася раней: у школу яны прыходзілі ў шэсць гадоў, а не ў сем. Але іх няўрымслівасць, жаданне пагуляць, неакрэплы фізічны стан і няўстойлівая ўвага пераносіліся ў клас, дзе патрабаваліся ўседлівасць, канцэнтрацыя ўвагі і цяга да ведаў. Адсюль і вынік: непаспяховасць і адставанне ад праграмы.

***— Які час вы лічыце найбольш эфектыўным?***

— Найлепшая сістэма адукацыі была ў СССР, мабыць, да вайны і адразу пасля яе, без уліку асобнага навучання хлопчыкаў і дзяўчатак. Хоць у мае школьныя гады колькасць вучняў у пачатковых класах была роўная 42. А калі набіралася 46, то выдаваліся два журналы. Пасля 4-га класа былі іспыты. Гэта быў не проста сродак кантролю: іх сэнс заключаўся ў тым, што паўтарэнне — маці навучання. Экзамены давалі магчымасць палепшыць гадавую адзнаку, паказаць свае веды. І тыя, хто не атрымаў станоўчую адзнаку, мусілі падцягваць свае веды летам і праходзіць пераэкзаменоўку. Калі вучэбны матэрыял за гэты час не быў засвоены, школьнік заставаўся на другі год. Рэпетытараў у той час не было. Настаўнікі займаліся са слабымі вучнямі пасля ўрокаў бясплатна. Бацькі апошніх імкнуліся прыцягнуць выдатнікаў для дапамогі сваім дзецям, усе спрабавалі падзяліцца ведамі. Нікому не хацелася заставацца на другі год. Я памятаю, як мяне папрасілі пазаймацца з хлопчыкам, на год малодшым за мяне. Паколькі нашы заняткі аказаліся паспяховымі, яго бацькі шчодра мне аддзячылі, але гэта было першай і апошняй платай за рэпетытарства ў маім жыцці.

А ў старшых класах школьнікі вывучалі латынь — мову мудрацоў і філосафаў.

***— Адкуль у вас такое моцнае жаданне выкладаць?***

— Усе тры мае родныя цёткі былі настаўніцамі пачатковых класаў. А адну з іх, Наталлю Міхайлаўну Фрэйндорф, можна назваць педагогам ад Бога. Гэта было адразу пасля вайны, калі ў школу прыходзілі дзеці-сіроты і дзеці-пераросткі. Дарэчы, у той час сірот у дзіцячых дамах было менш, чым цяпер, таму што, нават калі бацькі паміралі, хлопчыкаў і дзяўчатак забіралі блізкія сваякі.

У школе, дзе працавала мая цётка, вучыўся хлопчык з дзіцячага дома. Ён два гады прасядзеў у першым класе, і яго пакінулі на трэці. Ніхто з настаўнікаў не хацеў браць такога вучня, бо за другагодніцтва, вядома, не хвалілі, але і пераводзіць у наступны клас без ведання праграмы таксама не дазвалялася. Але Наталлі Міхайлаўне гэты хлопчык чымсьці спадабаўся, і яна ўзяла яго да сябе ў клас. І здолела не толькі навучыць грамаце, але і натхніла на поспех. У выніку ён скончыў універсітэт і пераехаў у Мінск. Але нават не гэта галоўнае. Калі ён працаваў у сталіцы, часта прыязджаў да нас у госці, яны гадзінамі гутарылі, і кожны раз пасля яго наведвання мы знаходзілі грошы, якія былі таемна пакінуты для былой настаўніцы. Навучыць можна ўсіх, але выхаваць удзячнага чалавека дадзена не кожнаму.

Некаторыя вучні на момант сустрэчы са мной, будучы ў другім ці трэцім класе, не ведалі, колькі будзе тры плюс тры і не маглі прачытаць слова «мама» нават па складах. Але, калі яны даганялі па праграме сваіх аднакласнікаў і пачыналі атрымліваць выдатныя адзнакі, адразу заяўлялі мне, што больш займацца не хочуць. Мабыць, гэта мая недапрацоўка, аднак усё роўна я вельмі задаволена тым, што дапамагла зрабіць гэтым дзецям крок у лепшую будучыню.

***— Ці моцна стаўленне дзяцей і бацькоў да педагога змянілася за гады вашай прафесійнай дзейнасці?***

— Вельмі моцна. У мае маладыя гады слова «настаўнік» нават рамаўлялася з іншай інтанацыяй. Быў стымул добра вучыцца, каб самому стаць настаўнікам. Мне здаецца, усё змянілася пасля таго, як у пачатку 1960-х гадоў абвясцілі лозунг: «Галоўны ў краіне — рабочы клас». На заводах пачалі атрымліваць заробак нашмат вышэйшы, чым быў у інжынераў, а тэхнічка ў школе атрымлівала столькі ж, колькі і настаўніца. Я памятаю выпадкі, калі хтосьці з бацькоў, хто быў членам прафкама на заводзе, прыходзіў да мяне ў школу і адчытваў за няўменне знайсці падыход да яго дзіцяці альбо крытыкаваў метады нашай работы. Але раней, на пачатку маёй настаўніцкай дзейнасці ў 1954 годзе, такое было абсалютна немагчымым, бо перад настаўнікам знімалі капялюш.

***— Што для вас важнае сёння?***

— Вельмі хацелася б падзяліцца сваімі думкамі з вялікім колам чытачоў з дапамогай маёй кнігі-зборніка з сямі навел. Яна для дзяцей, для тых, хто так ці інакш з імі звязаны, і ў першую чаргу для настаўнікаў. Гэта не навуковы трактат па педагогіцы і псіхалогіі, а творы з цікавымі сюжэтамі і лёсамі людзей, узятымі з жыцця. Але, аказваецца, для таго каб выдаць кнігу, трэба за гэта заплаціць. Параілі знайсці спонсара не толькі на выданне, але і на рэкламу, інакш публікацыя не мае сэнсу...

**Ульяна КАСЦЮНІНА, выпускніца 11 класа Ліцэя БДУ**



# Прафтэхустановы чакаюць абітурыентаў

**15 чэрвеня ў краіне распачалася ўступная кампанія ў прафесійныя ліцэі і прафесійна-тэхнічныя каледжы.**

У 2018 годзе прыём ажыццяўляюць 134 установы прафесійна-тэхнічнай адукацыі па больш чым 250 прафесіях. Акрамя таго, навучыцца рабочым прафесіям можна ў 48 установах адукацыі іншых узроўняў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

На гэты ўзровень адукацыі плануецца прыняць 31 тысячу чалавек, што на 1,3 тысячы больш у параўнанні з фактам прыёму 2017 года, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — 30,8 тысячы чалавек.

Каб гнутка рэагаваць на зменлівыя патрэбы рэгіянальных рынкаў працы, штогод удасканальваецца структура падрыхтоўкі. У 2018 годзе плануецца спыніць (прыпыніць) прыём па 168 незапатрабаваных прафесіях і адкрыць падрыхтоўку па 193 новых для асобных устаноў прафтэхадукацыі прафесіях. Таксама плануецца пачаць падрыхтоўку па дзвюх новых прафесіях: аператар працэсу перапрацоўкі збожжа і мантажнік каркасна-абшывачных канструкцый сухога будаўніцтва.

Прыём дакументаў на дзённую форму навучання будзе весціся да 20 жніўня. Калі да канца гэтага тэрміну не ўсе планавыя месцы будуць запоўненыя, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года. На завочную форму атрымання адукацыі дакументы будуць прымацца з 1 да 10 кастрычніка.

# Альтэрнатыва халадзільніку

**Вучоныя Белдзяржуніверсітэта прапанавалі бясшкодную «біяўпакоўку» на аснове хітазану для доўгачасовага захоўвання скорапсавальных прадуктаў. Над праектам працуе калектыў навукова-даследчай лабараторыі прыкладных праблем біялогіі кафедры заалогіі біялагічнага факультэта.**

Экалагічна чыстая «ўпакоўка» дазволіць павялічыць тэрміны захоўвання садавіны і агародніны, свіных і ялавічных туш, паўфабрыкатаў з птушкі і рыбы. «Біяўпакоўка» фарміруецца пры нанясенні на прадукты раствору хітазану. Гэта натуральны нетаксічны біяпалімер, які валодае бактэрыцыднымі ўласцівасцямі, а пры выпарэнні растваральніка ўтварае плёнкі на розных паверхнях. Важнай перавагай інавацыі з'яўляецца спосаб пакрыцця. Апрацаваць прадукты можна як на вытворчасці, так і ў палявых умовах з выкарыстаннем ручных або аўтаматычных распыляльнікаў. Таксама плёнка можа быць нанесена з выкарыстаннем сельскагаспадарчай тэхнікі. Акрамя таго, пакрыццё — гіпаалергеннае, яно не патрабуе папярэдняга выдалення з паверхні прадуктаў, а пры неабходнасці лёгка змываецца невялікім аб'ёмам вады. Таму прапанаваная тэхналогія з'яўляецца экалагічна чыстай і можа атрымаць шырокае прымяненне ў свеце.

Сёння ў краінах СНД і за мяжой аналагаў інавацыйнай прапанове вучоных БДУ не існуе. Як правіла, у харчовай прамысловасці для захоўвання фруктова-агароднінай прадукцыі прымяняюцца саставы з воскам, сумесі сыроватачнага альбуміну, аскарбінавай кіслаты, крухмалу з гліцэрынам і іншыя. Арганічныя спалучэнні і кансерванты, якія змяшчаюцца ў іх, выклікаюць розныя алергічныя рэакцыі. Распрацоўка навукоўцаў БДУ выключае ўжыванне дадзеных рэчываў і антыбіётыкаў.

У БДУ ўжо праведзены выпуск доследнай партыі раствораў для стварэння пакрыцця з хітазанам і пададзена заяўка на патэнт.

# Педагогі і медыкі аб'ядноўваюць намаганні

**Студэнты Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта разам са спецыялістамі РНПЦ «Кардыялогія» будуць навучаць здароваму ладу жыцця выхаванцаў сталічных дзіцячых садкоў і малодшых школьнікаў. План рэалізацыі адукацыйна-аздараўленчага праекта «Разам — да здароўя нацыі!» падпісалі рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК і дырэктар РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандр МРОЧАК.**

Згодна з праектам выкладчыкі, студэнты БДПУ і ўрачы навукова-практычнага цэнтра будуць праводзіць сумесныя мерапрыемствы для дзяцей дашкольнага ўзросту, педагогаў дашкольных устаноў, настаўнікаў школ і студэнтаў.

— Перш за ўсё ў гэты праект будуць уцягнуты факультэты дашкольнай і пачатковай адукацыі, дзе рыхтуюць будучых выхавальнікаў і настаўнікаў пачатковых класаў, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Менавіта на гэтай ступені закладваецца фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця і культуры здароўя. Акрамя таго, да праекта будзе прыцягвацца і факультэт прыродазнаўства, дзе лепш разумеюць, пра што кажуць медыкі, і змогуць выкласці важную інфармацыю на даступнай мове.

Ужо ў ліпені праект запрацуе ў мінскіх лагерах, што дзейнічаюць на базе 11 школ. Там пройдуць інфармацыйныя сустрэчы з дзецьмі, падчас якіх вучні пачатковых класаў даведаюцца пра асноўныя аспекты здаровага ладу жыцця, навучацца правільна вымяраць пульс, ціск і г. д. «У перспектыве мы плануем маштабіраваць гэты праект, хочам, каб ён пайшоў у рэгіёны. Для гэтага падключым рэгіянальныя ВНУ», — праінфармаваў рэктар БДПУ.

Плануецца, што выкладчыкамі БДПУ і ўрачамі-кардыёлагамі сумесна будуць выдадзены інфармацыйныя матэрыялы для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту па фарміраванні навыкаў здаровага ладу жыцця, а таксама метадычныя дапаможнікі для выхавальнікаў і настаўнікаў. Праект «Разам — да здароўя нацыі!» будзе выконвацца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Зачапіла

**Пра стыль жыцця, які адмаўляе прынцыпы спажывання (ён зарадзіўся ў Амерыцы ў канцы мінулага стагоддзя), пра людзей (у тым ліку ў нашай краіне), якія ўсё патрэбнае для сябе (прадукты, адзенне, абутак... І не ад дрэннага жыцця!) шукаюць на сметніцах, можна было б расказаць «чыста тэарэтычна», балазе інфармацыі на гэтую тэму шмат... Карэспандэнты звяздоўскай «Чырвонкі» адважыліся, што называецца, самі паспытаць фрыганскага хлеба: гэта значыць, прайсціся па сметніцах сталіцы і потым расказаць, што знайшлі. Як сведчыць «зваротная сувязь», рэпартаж шмат каго зачапіў за жывое. Асобныя з лістоў — без перабольшвання — варты ўвагі грамадскасці.**


6 ВАКОЛ НАС ЧЫРВОНКА

ЯК МЫ КАПАЛІСЯ Ў... СМЕТНІЦАХ,

ці Што такое фрыганства

ПОЙДЗЕНЬ — ЧАС «НЯХЛЕБНЫ»

АД ІСПАНСКАГА БРЭНДА...

# «МЫ НІКОЛІ НЕ ПРАСІЛІ ДАПАМОГІ...»

Ведаеце, я нават слова такога не чула — «фрыганства». А тут пра яго цэлы рэпартаж. Не ведаю, як іншых, а мяне ён узрушыў: пра тое, каб капацца ў сметніцах, сорамна і брыдка думаць, не тое што...

Нас, дзяцей, у бацькоў сямёра было. Старэйшая сястра нарадзілася ў 1943 годзе, самы малодшы брат — у 1958-м, я — у снежні 1949-га. А ў 1954-м згарэлі наша хата і хлеў. Пакуль будаваліся нанава, жылі ў лазні на другім баку вуліцы. Мы ўсе спалі ў парыльцы, а ў раздзявальні стаяла карова і свінні...

Цяпер нават уявіць немагчыма, як нам (а найперш бацькам — светлай памяці!) было цяжка! Хоць мы, малыя і не адчувалі гэтага так балюча. Праўда, працавалі ледзь не з тога часу, як пачыналі хадзіць: збіралі шчаўе, суніцы, чарніцы, дурніцы, грыбы, нарыхтоўвалі лыка і многае іншае. Ды і як інакай, калі побач — лес, калі нейкія пяць кіламетраў да Дняпра і балота, дзе была рыба... Там і так мы праводзілі час, самі зараблялі сабе на кніжкі і вопратку, ніколі не прасілі дапамогі. Мы лічылі гэта за ганьбу. А тут — адукаваная моладзь...

Пасля пятага класа ў час канікул у мяне было 27 выхадаў на працу ў саўгас. Тата 45 гадоў працаваў пастухом. Мы з мамай рукамі выбіралі гектары лёну. Да гэтага часу помню балючыя стрэмкі.

У памяці і тое, як непадалёк ад хаты агулам — кожны па тры радкі — палолі буракі. Але ў дарослых жанчын гэта атрымлівалася куды хутчэй. Я адставала. А таму, хоць ніхто не загадваў, не прымушаў, я скончыла сваю работу пасля таго як іншыя пайшлі на абед, потым збегала дамоў, прынесла кошык і вынесла з поля ўсё пустазелле.

Увечары прыехаў брыгадзір, убачыў, што мае радкі самыя чыстыя і перад усімі пахваліў.

Яшчэ помню, што ў школе нам прапаноўвалі бясплатны падмацунак — чай з булачкай. Мы адмовіліся, бо не маглі дапусціць, каб на нас глядзелі, як на бедных.

Адзенне, хай просценькае, тата нам шыў (ці перашываў ад старэйшых меншым), на ручной швейнай машынцы...

У інстытуце да трэцяга курса я насіла сінюю школьную тройку — тагачасную форму і даказала ж такі, што не адзежа здобіць чалавека, а наадварот... Ніхто і ні разу не папракнуў мяне ў беднасці. Можа таму, што мне самой было за яе не сорамна. Я найперш старалася вучыцца, каб атрымаць прафесію, каб парадаваць сваіх бацькоў.

Помню, у зімовую сесію на тым жа трэцім курсе ўсе сем экзаменаў я здала на выдатна, і майму тату на працу прыслалі падзячны ліст з інстытута. Пра гэта (ліст прыслалі яшчэ і ў школу) ведала ўся ваколіца, і, калі я прыехала на канікулы, усе сустракалі мяне з відавочнай павагай. Багацейшыя бацькі ставілі мяне ў прыклад сваім дзецям. Казалі, што няхай мы, Міхалюты, не маем тога дастатку, але ж, калі ёсць стараннасць...

Пасля вучобы я 12 гадоў працавала заатэхнікам, потым сакратаром сельвыканкама. Браты Анатоль і Уладзімір — вартавыя правапарадку — падпалкоўнік і маёр міліцыі (ужо ў адстаўцы). Марыя — работнік абласнога адраснага бюро, Лідзія — адміністратар Шклоўскай гасцініцы, Зоя і Кацярына да выхаду на пенсію працавалі на пошце.

Мы ўсе сумленна ставіліся да працы, выхоўвалі дзяцей, маем унукаў. Цяпер у нашай сям'і больш за 50 чалавек! Мы — горды і годны род Міхалютаў (на вялікі жаль, няма сярод жывых нашых бацькоў і старэйшай сястры), які ніколі не апускаўся і, спадзяюся, не апусціцца да гэтага....

Нават слова фрыганства паўтараць лішні раз не хочацца. Можа, тады на яго забудуцца нашчадкі тых, хто выстаяў у час вайны, хто з руін падняў гарады і вёскі, дзеля таго, каб мы жылі дастойна?

**Ніна Іванаўна Суран (Міхалюта),**
*в. Горная Рута*
*Карэліцкі раён.*

# УСЕ МЫ ТРОШКІ... ФРЫГАНЫ?

**Пра канфлікты з зяцямі ды нявесткамі можа расказаць ці не кожная цешча, свякроў. І дзіўнага ў тым нічога, бо, мякка кажучы, не разумееш часам учынкі родных дзяцей, а тут жа чужыя, з іншых сем'яў, з іншых мясцін...**

Добра памятаю, як ажаніўся наш сын, як з'явілася на кухні яшчэ адна гаспадыня, як яна аднойчы вечарам узялася «чысціць» свае (сталаваліся мы паасобку) палічкі ў халадзільніку — даставаць з іх нейкія прадукты, ставіць ля вядра са смеццем.

Убачыўшы побач з ім нават не адкрытыя яшчэ пакеты з малаком ды смятанай, я, вядома ж, здзівілася. А нявестка тут жа растлумачыла, што ўсё гэта сапсаванае, што на ўсё скончыўся тэрмін прыдатнасці: на смятану — два дні таму, на малако — учора.

Пачуўшы гэта, апошняе, я засмяялася: спытала, што ж адбылося з тым малаком у 12 гадзін ночы?

Не ведаючы, што адказаць, маладая гаспадыня прамаўчала, а я, скарыстаўшыся паўзай, паспела дадаць відавочнае. І сапраўды, да 12 гадзін 20 чэрвеня (умоўна) гэта малако было яшчэ добрае, а назаўтра, пасля 12, ужо не... Хутчэй за ўсё, сказала нявестцы, ніякай хімічнай рэакцыі там не адбылося: прадукт можна і трэба пакаштаваць ды скарыстаць, калі не на малочны суп, то ўжо на бліны альбо цеста для аладак...

Яшчэ я тады сказала, што ў Балгарыі ды Польшчы няма такіх жорсткіх абмежаванняў: «прыдатны да ...» (а потым, маўляў, ужо непрыдатны...). Там пішуць, што прадукт найлепш скарыстаць да пэўнага тэрміну, а потым ужо, як у песні, «думайте сами, решайте сами»...

У адказ на гэта мая нявестка, хоць і нясмела, але ж досыць цвёрда запярэчыла: сказала, што сваю сям'ю яна будзе карміць толькі свежымі прадуктамі.

Яе права... Я тады проста папрасіла яе не выкідваць вось гэтыя «нясвежыя» ў смеццеправод — акуратненька пакласці побач: раптам хто забярэ?

Як і варта было чакаць, да раніцы малако са смятанай зніклі. Так што свайго роду фрыганы ў нас былі яшчэ ў мінулым стагоддзі.

Туды ж, да смеццеправода, мы з нявесткай выносілі потым непатрэбны абутак, адзежу, старую бытавую тэхніку. І ўсё гэта нехта забіраў.

У свой час забіралі і мы. Праўда, не са сметніцы, але...

Я некалі шмат чула, але доўга не наважвалася зазірнуць у крамы, дзе гандлююць так званым паношаным адзеннем з Еўропы (сэканд-хэнды). Але ж мы ўзяліся будаваць дачу, спатрэбілася рабочае адзенне. На новае — тыя ж курткі, світары, штаны — траціцца не хацелася (без таго расходаў хапала)... А таму куплялі ношанае. І, дарэчы, носім яго дагэтуль, бо рэчы добрыя...

А потым суседка сабралася пераязджаць да дачкі ў Падмаскоўе. Кватэру ў Мінску яны прадавалі, нешта з рэчаў забіралі з сабой, усё астатняе збіраліся выносіць на сметніцу. Мы з мужам «ураталі» ад гэтага хай старэнькую, але ж мэблю для кухні, дзве палічкі для кніг, прыгожы керамічны посуд. З удзячнасцю ўспамінаючы суседку, карыстаемся ўсім і сёння.

...Цяпер у краіне будуюцца заводы для перапрацоўкі смецця і гэта за шчасце, бо людзі апошнім часам «абрастаюць» ім, можна сказаць, з касмічнай хуткасцю. Прычым выкідваюць не толькі непрыдатнае, нікому не патрэбнае, але і тое, што можа яшчэ доўга служыць. А таму, на мой погляд, не варта асуджаць людзей, якія (незалежна ад прычын) зазіраюць на сметніцы. Не паверыце, але якраз там наш сусед па дачы падабраў нядаўна тры невялічкія старыя каструлі. Яго жонка насадзіла ў іх кветак. Зайздросная прыгажосць: хоць ты схадзі ды глянь, ці не засталося там яшчэ нечага такога...

**Таіса М.,** *г. Мінск*

■

■ Так ці не? Практыкум

# Скачы, пакуль малады...

**Два пытанні ад спадара Анатоля з Паставаў: «Калі хочуць падкрэсліць грунтоўнасць чытання, то па-руску кажуць *«От корки до корки»*. А як перадаць гэта па-беларуску?»**

**Яго ж, Анатоля, цікавіць, як перакласці *«дом стоял в отдалении»*.**

**«На слыху выраз *«скакаць з парашутам»*, але ці правільна ўжываць тут слова «скокі»?» — пытаецца спадар Антон з Мінска.**

**«Ёсць у нашай мове слова *«вырашыцца»*, — піша Юлія са Старобіна, — але казаць, што нехта «вырашыўся і сеў за руль», па-мойму, няправільна?»**

**Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. Рускае слова *корка* перакладаецца на беларускую як кара, скарынка, лупіна, скурка і вокладка. Таму выраз *от корки до корки* паводле «Руска-беларускага слоўніка» можа гучаць як **ад вокладкі да вокладкі.**

У гэтым жа значэнні ўжываецца і нашае **ад дошкі да дошкі** (першапачаткова вокладкі рабілі з цэльнага куска дрэва, які абцягваўся скурай). Гэты выраз знаходзім у «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы», а таксама ў «Слоўніку фразеалагізмаў» Івана Лепешава (навукоўца, які спецыялізаваўся на ўстойлівых выразах). Таму і мы раілі б аддаваць перавагу другому фразеалагізму і чытаць (у тым ліку «Звязду») **ад дошкі да дошкі, з першай старонкі да апошняй.**

«Руска-беларускі слоўнік» рэкамендуе раздзяляць дзеянне **(аддаленне)** і адрэзак прасторы, часу **(адлегласць)**. Пра падобнае раздзяленне іншых пар мы пісалі мінулы раз. Такім чынам, правільна будзе гаварыць *дом стаяў на адлегласці,* але ёсць, вядома ж, выпадкі, калі трэба ўжываць і слова *аддаленне*:

*Калі ў дзень сустрэчы ён казаў ёй «ты», то цяпер звяртаўся на «вы», як належыць лекару да хворай. На такое аддаленне ён пайшоў свядома* (Іван Шамякін. «Сэрца на далоні»).

2. Безумоўна, *скокі* з парашутам — гэта нешта анекдатычнае, бо скокі — гэта па-беларуску танцы:

*Я і скакаць навучыўся, з ёю польку скакаў, — скокі не такі ўжо грэх...* (Максім Гарэцкі. «У чым яго крыўда?»).

Таму калі гаворка пра парашуты, то тут, вядома ж, ужываецца слова **скачкі**.

3. Так, сапраўды, *вырашыцца* значыць 'стаць вырашаным': *пытанне вырашылася, сёння ўсё вырашыцца.*

А вось каб сказаць, што нехта прыняў рашэнне нешта зрабіць, то трэба ўжыць словы **надумаць, надумацца:** *надумалі з братам адведаць бацькоў, надумаўся паехаць у заробкі.*

Здараецца, што прыняць нейкае рашэнне цяжка — для гэтага патрэбна смеласць. Тады кажуць **адважыцца, асмеліцца:** *адважыўся загаварыць з незнаёмкай, асмеліўся запярэчыць начальніку.*

**У АБАРОНУ СЛОЎ**

Памяшканне, дзе **пераадзяваюцца,** па-беларуску, натуральна, называецца **раздзявальня** або па-расейскаму **раздзявалка**. Раздзяваць, раздзецца, раздзявальня — паўнапраўныя адзінкі слоўнікавага складу беларускай мовы. (Пра сінонімы *апранаць і надзяваць* мы пісалі раней. Таму зараз толькі нагадаем, што *апранаюць* верхняе адзенне — вопратку, — а вось *надзяваюць* усё астатняе.)

Месца, дзе здымаюць і пакідаюць **вопратку,** — апроч гардэроба — называюць яшчэ **апранальняй**.

Думаецца, што ўсе гэтыя словы могуць прыдацца ў адпаведных сітуацыях, таму лічыць нейкія з іх лішнімі не варта

■

■ Весткі з месцаў

# Кнігу напісалі... настаўнік і вучаніца

**З'ява ў культурным жыцці раёна: у свет выйшаў даведнік «Пісьменнікі Пастаўшчыны».**

У ім увазе чытачоў прапануецца гістарычны агляд літаратурнага руху, звесткі пра адметныя імпрэзы і альманахі, пра паэтаў, пісьменнікаў, перакладчыкаў, лінгвістаў, лёс якіх звязаны з Пастаўшчынай. Сярод іх такія вядомыя ў Беларусі асобы, як Марыя Вайцяшонак, Уладзімір Дубоўка, Юлія Зарэцкая, Ігар Капылоў, Алесь Касцень, Міхась Кенька, Янусь Малец, Ніна Захарэвіч, Пётр Мурзёнак, Аркадзь Нафрановіч... Усяго — пяцьдзясят персаналій.

Выданне будзе карысным для ўсіх, каму блізкія паняцці культуры і духоўнасці, хто цікавіцца літаратурнай спадчынай беларускіх творцаў. А стварылі яго вучаніца 11 класа пастаўскай гімназіі Хрысціна Клянтак і яе настаўнік — краязнаўца Ігар Пракаповіч.

**Б. Лава,** *г. Паставы.*

Горкая дата

# ВАЙНУ ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ У ДЭТАЛЯХ

## Адзін з найстарэйшых франтавікоў краіны ўзгадаў пачатак Вялікай Айчыннай

**Вайна — гэта страшнае слова. У 1941-м яна мяняла жыццё, ламала лёсы, разлучала людзей. Дзякуючы подзвігу дзядоў і прадзедаў сёння пра вайну многія ведаюць толькі па гістарычных звестках і музеях.**
**А яны за нас прайшлі ўсе яе жахі. Менавіта лёс і жыццёвы вопыт ветэранаў нам зараз нагадвае пра сапраўдную цану мірнага неба над галавой.**
**Напярэдадні Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны адзін з найстарэйшых франтавікоў Беларусі, якому спаўняецца 95 гадоў, ветэран, удзельнік бітвы пад Масквой Міхаіл Сяргеевіч САМОНАЎ падзяліўся тым, як для яго пачыналася вайна, расказаў пра страх першага бою і пра тое, чаму трэба заўсёды памятаць.**



### Нельга быць гатовым

Вялікую Айчынную ён прайшоў ад пачатку і да канца. На палях яе бітваў правёў сваю маладосць. Там жа і пасталеў. Сёння пра вайну Міхаілу Сяргеевічу нагадваюць два раненні, ордэны і медалі. А таксама пачуццё жаху і горыч страт.

Па словах Міхаіла Сяргеевіча, вайна для яго пачалася раней за 1941-ы.

«Пасёлак, дзе я жыў, называецца Яроміна і знаходзіцца пад Гомелем. Там недалёка праходзіла чыгунка з Украіны ў Ленінград. Яшчэ да пачатку вайны я і мае сябры бачылі, як цягнікі перавозілі ваенную тэхніку. Памятаю, як на сходах камсамола мы абмяркоўвалі, што трэба пачынаць рыхтавацца да вайны. Мы ўжо тады падазравалі, што яна магчымая», — расказвае Міхаіл Самонаў.

Для гэтага ён амаль кожны тыдзень ездзіў з сябрамі ў Гомель, дзе практыкаваўся ў стральбе. Таксама з дзяцінства марыў быць лётчыкам. Праходзіў усе тэсты па здароўі. Вычыўся лятаць на самалёце У-2, але лётчыкам так і не стаў. А вось страляць навучыўся трапна. Калі яго мабілізавалі, ён ужо паказваў выдатны вынік. Напачатку адправілі ў тыл і залічылі ў Варонежскую школу малодшых авіяспецыялістаў стралком-радыстам.

«Памятаю, як мяне і маіх сяброў мабілізавалі і павезлі з Гомеля ў Арол. У нейкай ступені мы былі гатовыя да вайны. Але гэта толькі тэарэтычна. На практыцы да яе нельга быць цалкам гатовым», — падзяліўся ветэран.

### Першы бой і абарона Масквы

Першае хрышчэнне агнём у Міхаіла Самонава прайшло падчас абароны Масквы ў канцы 1941-га і пачатку 1942 года. Іх падраздзяленне размясцілі ў Хімках, а праціўнік быў у горадзе Сонечнагорск. Паступіла задача адбіць горад. Выканаць загад было складана, бо населены пункт ужо ўмацавалі і падрыхтавалі да абароны. Менавіта тады Міхаіл Сяргеевіч упершыню адчуў страх страціць сваё жыццё.

«Памятаю, як аддалі загад на штурм. У першых хвілінах бою я бачыў, як гінуць мае таварышы. Тады мне стала страшна памерці ў самым пачатку вайны. У гэтым баі загінула шмат хлопцаў 18—20 гадоў. Першае хрышчэнне было горкае», — прыгадвае Міхаіл Самонаў.

Памятае і як у складзе 102-га спецбатальёна ў наступленні поўз, прыціскаючыся да снегу, які станавіўся чырвоным ад крыві. Як задыхаўся, калі пераносіў часткі кулямёта і патроны, каб падтрымаць агнём сваіх. Тыя дні для яго былі самыя цяжкія. Памятае і як наступалі ў 25-градусны мароз, калі не было дзе грэцца. Тады пад Масквой паўсюль былі суцэльныя магілкі і разбітая нямецкая тэхніка, павернутая на захад. А гэта выклікала радасць і азначала, што немцы ўцякалі. Салдаты зразумелі, што адстаялі Маскву.

### Не было часу думаць пра смерць

Аднак ужо пасля бітвы пад Масквой вайна стала звыклай. Як кажа Міхаіл Сяргеевіч, у яго папросту не было часу на тое, каб думаць пра смерць або адчуваць страх. І гэта, як ён кажа, не бравада, а псіхалогія.

Ужо потым Міхаіл Самонаў прайшоў Калінінскі фронт, Першы Прыбалтыйскі, дайшоў да Кёнігсберга. Нават цяпер яму цяжка зразумець, як ён выжыў, бо смерць была паўсюль.

«Мы выйгралі Вялікую Айчынную мільёнамі чалавечых жыццяў. Мільёнамі ахвяр. Мне незразумела, чаму пасля такой трагедыі людзі да гэтага часу развязваюць пра вайну? Не дай ёй бог здарыцца. Вайна гэта страшна. Каб яна не паўтаралася — трэба памятаць», — лічыць ветэран.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

Падзея

# ПАД АХОВАЙ «ТОРАЎ»

**У чэрвені непадалёку ад Астраўца быў урачыста адкрыты ваенны гарадок 1146-га гвардзейскага зенітнага ракетнага палка. Ён будзе прыкрываць Беларускую АЭС з паветра. Станцыя знаходзіцца адсюль у зоне прамой бачнасці.**

Полк узброены зенітнымі ракетнымі комплексамі «Тор-М2», якія зусім нядаўна паступілі ў армію. Усяго адна такая машына здольная аднachасова знішчыць да васьмі цэляў.

— Полк на паўночна-заходнім кірунку выконвае задачы прыкрыцця паветранай прасторы Беларусі, — паведаміў **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ**. — Падчас работы агульнай сістэмы ППА полк будзе ажыццяўляць фізічнае прыкрыццё атамнай электрастанцыі, якая ўводзіцца ў эксплуатацыю налета. Чаму для ўзбраення выбраны менавіта комплексы «Тор-М2»? Гэты кірунак мы лічым адным з самых важных. І лагічна, што яго прыкрые найноўшая зброя.

Акрамя таго, 1146-му гвардзейскаму зенітнаму ракетнаму палку быў уручаны баявы сцяг. Знамянальна, што гэтая падзея ў гісторыі фарміравання адбылася ў юбілейны год Узброеных Сіл. Полк быў сфарміраваны ў 1956 годзе на базе 36-га гвардзейскага асобнага зенітна-артылерыйскага дывізіёна, які ў 1941 годзе ахоўваў Дарогу жыцця ў блакадны Ленінград.



— Уручэнне баявога сцяга займе асаблівае месца ў гісторыі палка, — сцвярджае **камандзір палка гвардыі падпалкоўнік Дзяніс ЗЫК**. — Тут падабраны найлепшыя з найлепшых ваеннаслужачых ВПС і войск ППА. У другім паўгоддзі сілы будуць скіраваны на падрыхтоўку і правядзенне тактычнага вучэння з баявой стральбой на палігоне Ашулук у Расіі.

Сімвал воінскага гонару і славы ваеннаслужачыя часці сустракалі ў новым ваенным гарадку. Ён з'яўляецца ўнікальным для нашай краіны. Будаўніцтва гарадка распачалося не так і даўно — у лютым 2016 года. Усе яго складнікі — штаб, навучальны корпус, казармы, клуб, парк машын, сталовая, пакоі вольнага часу, інфармавання — узведзены з нуля і цалкам прыстасаваны пад патрэбы цяперашняга часу.

— Навучальны корпус змяшчае дзевяць класаў для кожнай спецыяльнасці, — кажа **старшы памочнік начальніка штаба капітан Аляксандр НАВУМЧЫК**. — Яны абсталяваны самай сучаснай камп'ютарнай тэхнікай, узорамі і макетамі ўзбраення, тэматычнымі плакатамі з асноўнымі тактыка-тэхнічнымі характарыстыкамі. На кожным камп'ютары ўстаноўлены спецыяльныя праграмы, якія рыхтуюць спецыялістаў да работы на зенітна-ракетных комплексах. Тэсты таксама праводзяцца дыстанцыйна на камп'ютарах.

Спрадвечнае жыллёвае пытанне таксама вырашаецца. Прычым мяркуецца абысціся без інтэрнатаў. Так, для афіцэраў палка ў Астраўцы ўзведзены 84-кватэрны службовы дом. Мяркуецца, што ўжо ў ліпені да яго дадасца яшчэ адзін дом, але гэтая новабудоўля будзе разлічана на 40 кватэр.

Для размяшчэння ж асабовага складу пабудаваны новыя прасторныя і ўтульныя казармы. Побач з кожнай з іх знаходзіцца невялікі спартыўны куток. Спартыўная зала прасторная і цудоўна падыходзіць для камандных гульняў з мячом. Побач з ёй — сучасная «трэнажорка». Ёсць тут і стадыён са спецыяльнай бегавой дарожкай.

Тут жа размешчаны і клуб — сучасны будынак з прасторнымі фае і вялікімі шклянымі сцэнамі. Яго таксама абсталявалі па-сучаснаму: велізарная глядзельная зала мае мультымедыйную і гукаўзмацняльную апаратуру. Дайшлі новыя тэндэнцыі і да бібліятэкі. Акрамя звыклага кніжнага фонду, тут ёсць і некалькі аўтаматызаваных працоўных месцаў.

— Увядзенне ў строй новага ваеннага гарадка — гэта падзея, — працягвае Андрэй Раўкоў. — Вельмі важна стварыць для воінскай часці такія ўмовы, у іх салдаты і афіцэры будуць займацца толькі баявой падрыхтоўкай, мінімальна пры гэтым адрываючыся на разнастайныя гаспадарчыя пытанні. Гэта падзея знакавая і для асабовага складу. Трэба, каб байцы служылі добра, на радасць бацькам і славу краіне.

Валяр'ян ШКЛЕННІК



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

■ Як гэта было

# НЕРЭАЛІЗАВАНЫ ПРАЕКТ

**Сёлета ў нашай краіне шырока адзначаецца 100-годдзе стварэння Узброеных Сіл. Аднак чамусьці ў цені засталася трансфармацыя арміі ў эпоху станаўлення Беларусі як суверэннай дзяржавы. А менавіта ж у гэты час і было сфарміравана будучае аблічча нацыянальнай мадэлі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь — неад'емнага атрыбута яе дзяржаўнасці.**

27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». Гэта стала адпраўным пунктам пачатку існавання суверэннай Беларусі.

Аднак урад БССР і Узброеныя Сілы, дыслакаваныя на тэрыторыі рэспублікі, на Дэкларацыю ніяк не адрэагавалі. Армія праводзіла планавую баявую падрыхтоўку ў адпаведнасці з распараджэннямі міністра абароны СССР, захоўваючы пры гэтым поўны нейтралітэт. Больш за тое, колькасць войскаў на тэрыторыі рэспублікі расла, дасягнуўшы да жніўня 1991 года каля 300 тысяч вайскоўцаў і вольнанаёмных. Ды і канцэнтрацыя вайсковых часцей і злучэнняў на тэрыторыі БССР была самай высокай у Еўропе. Адзін ваенны прыпадаў на 43 чалавекі грамадзянскага насельніцтва. Пры гэтым ва Украіне — на 98, а ў Расіі — на 634.

Што ж уваходзіла ў групоўку войскаў на тэрыторыі Беларусі да гэтага часу?

Гэта былі 5-я і 7-я танкавыя арміі, 28-я агульнавайсковая армія, 120-я мотастралковая дывізія, 51-я авіяцыйная дывізія, 72-я вучэбная дывізія і іншыя злучэнні і часці, аб'яднаныя ў Беларускую ваенную акругу. Акрамя таго, дыслакаваліся і часці цэнтральнага падпарадкавання. Гэта 26-я паветраная армія ў складзе авіяцыйнай дывізіі і шасці авіяцыйных палкоў, часці 46-й паветранай арміі ў складзе сямі авіяцыйных палкоў, 103-я паветрана-дэсантная дывізія, 38-я паветрана-дэсантная брыгада, 11-ы корпус 2-й асобнай арміі СПА, 28-я паветраная армія, злучэнні і часці РВСП (50-я ракетная армія войскаў стратэгічнага прызначэння ў складзе чатырох ракетных дывізій, якія мелі на сваім узбраенні ядзерную зброю), злучэнні і часці далёкай авіяцыі, Ваенна-марскога флоту і спецыяльных войскаў, якія падпарадкоўваліся ў той час непасрэдна Міністэрству абароны СССР і галоўкамам відаў Узброеных Сіл.

18 жніўня 1991 года міністр абароны СССР Дзмітрый Язаў аддаў распараджэнне на падрыхтоўку ўводу ў Маскву 2-й мотастралковай, 4-й танкавай і 106-й паветрана-дэсантнай дывізій. Падзеі вакол ДКНС (ГКЧП) пацвердзілі, што Узброеныя Сілы СССР захоўвалі сваю баяздольнасць, былі ў стане вырашаць пастаўленыя перад імі задачы. Беларуская ваенная акруга таксама была прыведзена ў павышаную баявую гатоўнасць. Гэтыя падзеі чарговы раз паказалі, што незалежнасць трэба абараняць, і для гэтага патрэбныя ўласныя ўзброеныя сілы.

Таму Вярхоўны Савет БССР 25 жніўня 1991 года прымае рашэнне аб наданні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ад 27 ліпеня 1990-га статусу канстытуцыйнага закона. Дэ-факта ўсё гэта азначала абвяшчэнне незалежнасці рэспублікі. 20 верасня 1991 года Вярхоўны Савет прымае пастанову аб стварэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Яго і варта лічыць пунктам адліку пачатку стварэння ўласных Узброеных Сіл.

Канцэпцыя вызначала, што Узброеныя сілы з'яўляюцца тэрытарыяльнымі фарміраваннямі рэспублікі і павінны функцыянаваць на аснове Канстытуцыі і законаў краіны, а таксама статутаў, інструкцый, настаўленняў і дапаможнікаў, якія зацвярджаюцца Вярхоўным Саветам і падпарадкоўваюцца толькі Прэзідэнту краіны, які па сваім статусе вызначаўся як Вярхоўны Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі. Акрамя таго, бачылася наступная структура Узброеных Сіл: Беларускае войска, Рэспубліканская гвардыя, Пагранічная ахова.

Канцэпцыя прадугледжвала адсутнасць уласных узброеных фарміраванняў у Камітэце дзяржаўнай бяспекі і Міністэрстве ўнутраных спраў. Меркавалася, што агульнае кіраўніцтва Узброенымі Сіламі ў мірны час будзе ажыццяўляць Вярхоўны Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі праз Савет нацыянальнай бяспекі, Міністэрства абароны, аб'яднаны штаб Беларускага войска, штабы Рэспубліканскай гвардыі і Пагранічнай аховы, а ў ваенны час — праз Савет абароны рэспублікі. Пры гэтым Міністэрства абароны павінна было быць рэспубліканскай грамадзянскай установай і ўзначальвацца грамадзянскай асобай — міністрам абароны.

Прадугледжвалася рэарганізацыя існуючых органаў кіравання, злучэнняў і часцей Беларускай ваеннай акругі, а таксама іншых воінскіх часцей і падраздзяленняў Міністэрства абароны СССР, дыслакаваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з перадачай іх функцый, бюджэтаў, штатаў, запасаў матэрыяльных сродкаў, тэхнікі, фондаў і аб'ектаў, вытворчых магутнасцяў у распараджэнне рэспублікі. Апроч гэтага, узнікла ідэя правядзення дэмакратызацыі арміі. Вайскоўцы маглі аб'ядноўвацца ў прафесійныя саюзы, уводзілася поўная забарона на любую партыйна-палітычную дзейнасць у арміі.

Камплектаваць Узброеныя Сілы меркавалася на добраахвотнай аснове па асабістым жаданні грамадзян з 20 гадоў. Працягласць тэрміновай ваеннай і альтэрнатыўнай службы ўстанаўлівалася ў 18 месяцаў, з іх 6 месяцаў складаў абавязковы курс агульнай ваеннай падрыхтоўкі ў вучэбных цэнтрах краіны.

Фарміраванне Узброеных Сіл меркавалася ажыццявіць у тры этапы і завяршыць на працягу дзевяці гадоў — да 2000-га. Аднак Вярхоўны Савет адклаў разгляд Канцэпцыі. Толькі 11 снежня 1991 года была прынята пастанова аб прызначэнні міністра па справах абароны Рэспублікі Беларусь. А праз чатыры дні Беларусь наведвае Дзяржсакратар ЗША Джэймс Бэйкер. У ходзе яго сустрэчы з вышэйшым кіраўніцтвам краіны абмяркоўваліся пытанні бяспекі. Тагачасны міністр па справах абароны Беларусі Пётр Чавус у адным з інтэрв'ю ўспамінае: «Раніцай 15 снежня, перад сустрэчай з Бэйкерам, я зайшоў да Кебіча. Пытаюся: «Вячаслаў Францавіч, навошта прыязджае Бэйкер?» — «А хто яго ведае!» Я сказаў: «Вы павінны ведаць, што амерыканцаў сёння больш за ўсё хвалюе ядзерная зброя на нашай тэрыторыі, яны плануюць даведацца, што мы хочам з ёй рабіць». Кебіч звязаўся з Шушкевічам: «Станіслаў Станіслававіч, навошта да нас прыязджае Бэйкер?» — «Не ведаю». — «Тут у мяне Чавус сядзіць, кажа, што амерыканцаў хвалюе ядзерная зброя на нашай тэрыторыі». Шушкевіч паклікаў нас да сябе, я давёў да іх ведама, навошта прыязджае Бэйкер, а таксама расказаў, колькі і якая ў нас ядзернай зброя. Сустрэча была ў рэзідэнцыі на Вайсковым завулку, з абодвух бакоў — чалавек па 20. Сабраліся на першым паверсе, а Бэйкер і кажа: «Вы пакуль тут пасядзіце, а мы ўтрох — ён, Кебіч і Шушкевіч — паднімемся на другі паверх».

Яны гутарылі гадзіны дзве, мы ўнізе таксама. Амерыканцы пыталіся, як мы будзем будаваць Узброеныя Сілы. Я выказаў сваё меркаванне: «Беларусь будзе бяз'ядзернай, нейтральнай дзяржавай і мець уласныя Узброеныя Сілы, пабудаваныя ў адпаведнасці з Канцэпцыяй, якую цяпер разглядае Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пасля гэтай сустрэчы на працягу кароткага часу Вярхоўны Савет ухваляе Канцэпцыю стварэння Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, вызначае іх колькасць у 100 тысяч чалавек і прымае наступныя нарматыўныя акты: 11 студзеня 1992 года — пастанову «Аб Узброеных Сілах, якія дыслакуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», 18 сакавіка 1992-га — пастанову «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь».

20 сакавіка 1992 года ўрад Рэспублікі Беларусь прымае пастанову «Аб стварэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь». Гэты дзень можна лічыць датай пачатку стварэння беларускай арміі. У адпаведнасці з пастановай былыя войскі Беларускай ваеннай акругі пачалі ператварацца ў армію незалежнай краіны.

Аднак прынятая ў 1991 годзе Канцэпцыя пабудовы Узброеных Сіл, па сваёй сутнасці, так рэалізавана і не была. Замест будаўніцтва Узброеных Сіл у адносінах да Беларускай ваеннай акругі, якая павінна была стаць іх асновай, доўгі час праводзілася скарачэнне, затым аптымізацыя і рэфармаванне. І толькі ў 2005-м быў упершыню прадстаўлены План будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл на 2006—2010 гады. Таму пятнаццаць першых гадоў існавання арміі ў незалежнай Беларусі яшчэ чакаюць сваіх гісторыкаў.

**Леанід МАРТЫНАЎ**

❍ Дасье «Звязды»

**Леанід Мартынаў, палкоўнік у адстаўцы**

**Падчас службы ў Міністэрстве абароны Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці са службовымі абавязкамі займаўся ў тым ліку і пытаннямі пабудовы Узброеных Сіл. Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні праваой базы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Удзельнічаў у распрацоўцы Законаў Рэспублікі Беларусь «Аб абароне», «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь», «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», «Аб мабілізацыйнай падрыхтоўцы і мабілізацыі» і інш. Пасля заканчэння службы працаваў у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрстве эканомікі, Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце, Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Цяпер працягвае працаваць на адным з прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у абаронны сектар эканомікі нашай краіны.**

■ Вакацыі

# АДПАЧЫНАК АСАБЛІВАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ

**Летні адпачынак можна правесці і з ваенна-патрыятычным ухілам. На 361-й базе аховы і абслугоўвання цэнтральных органаў ваеннага кіравання ўжо трэці год запар арганізавалі ваенна-патрыятычны профільны атрад.**

«У атрадзе 17 вучняў з дзвюх школ Заводскага раёна сталіцы. У нас праходзіць адна змена сёлета з 2 да 26 чэрвеня. Для дзяцей мы арганізавалі заняткі па ўсіх ваенных дысцыплінах. Аднак для іх усё арганізавана ў гульнявой форме, каб лепш засвойвалі інфармацыю», — расказаў **начальнік аддзялення ідэалагічнай работы 361-й базы аховы і абслугоўвання цэнтральных органаў ваеннага кіравання, капітан Юрый ТРАСЦЯНКА**.

За адным з такіх заняткаў карэспандэнту «Звязды» ўдалося паназіраць асабіста. Яшчэ ўчарашнія сямі- і васьмікласнікі з усёй сур'ёзнасцю і ўдумлівасцю знаёміліся з індывідуальным стралковым узбраеннем. Інструктары расказвалі ім аб тактыка-тэхнічных характарыстыках, вучылі збіраць і разбіраць аўтамат Калашнікава, ладаваць магазіны патронамі. Дзеці прымяралі бронекамізэлькі і каскі.

Далей, нягледзячы на невялікі дождж, «вайскоўцы» мужна праходзілі паласу перашкод з інструктарам, які падказваў і дапамагаў ім. Не абмінулі і трэніроўку па навучанні асновам рукапашнага бою. Усё як у салдат. І гэта нягледзячы на тое, што сярод удзельнікаў атрада былі дзяўчынкі. Варта адзначыць, што некаторыя з іх збіралі аўтаматы хутчэй за юнакоў і добра сябе праявілі на паласе перашкод.



«Ёсць і шэраг культурных мерапрыемстваў: наведванне музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, комплексу «Лінія Сталіна», музея зброі часці, дзе экспанаты можна трымаць у руках. У планах ёсць таксама экскурсіі ў Хатынь і на Курган Славы», — дадаў Юрый Трасцянка.

Адзін з удзельнікаў ваенна-патрыятычнага атрада **Даніла ПЯТРОЎ, вучань 124-й школы**, у свой 15-ы дзень нараджэння вырашыў пачаць раніцу з заняткаў у атрадзе. Кажа, што без сяброў свята не тое, а яны не любяць прапускаць ваенна-патрыятычны лагер. Ды і сам юнак вельмі любіць гісторыю, а з прычыны таго, што зброя з'яўляецца яе неад'емнай часткай, вельмі ёй цікавіцца. Лішні раз папрактыкавацца ў разборцы аўтамата для яго ў радасць.

**Кіраўнік профільнага ваенна-патрыятычнага атрада, выкладчык музыкі і сусветнай мастацкай культуры 124-й школы Мінска Галіна КАЗАЧОК** расказала, што сабраць групу было нескладана. «Толькі 10 чалавек трэба было набраць ад нашай школы, а ахвотных было ўдвая больш. Ішлі найлепшыя. У нас нават быў конкурс», — растлумачыла кіраўнік атрада. Таксама, па яе словах, у лагеры ў дзяцей практычна няма пропускаў, яны забываюць пра гаджэты. Часу на іх проста няма — заняткі выклікаюць у вучняў вялікую цікавасць.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: трактор МТЗ-80Л, заводской № 795452, 1991 г. в. Наличие возможных неисправностей и дефектов: отсутствует стекло левой двери кабины водителя; отсутствует передняя решетка капота; нет топливного фильтра; нет аккумуляторов; топливный насос разукомплектован; стартер, генератор находятся в нерабочем состоянии; рулевое управление имеет большие люфты; блокировка задних колес не работает; в гидросистеме имеются утечки

Начальная цена продажи – 1 676,40 руб. (одна тысяча шестьсот семьдесят шесть рублей сорок копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 167 р. (сто шестьдесят семь рублей)

Продавец – Волковысское районное унитарное предприятие «Селекционно-племенной центр животноводства», 231900, г. Волковыск, ул. Советская, 159, тел. 8-01512-94180, факс – 8-01512-44069

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 23 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 17 июля 2018 г. до 15.00**

Телефоны для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by

## ДОПОЛНЕНИЕ И ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом № 16 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» № 193 (28557) от 06.10.2017

Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

62 (шестьдесят две) квартиры без выполнения внутренних отделочных работ на 2, 7, 12, 13-15, 18-21, 23 этажах, в том числе,

– 17 (семнадцать) однокомнатных квартир общей площадью от 45,36 до 45,76 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 200 долларам США,**

– 10 (десять) двухкомнатных квартир общей площадью от 68,46 до 68,66 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 150 долларам США,**

– 9 (девять) двухкомнатных квартир общей площадью от 70,72 до 71,12 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 150 долларам США,**

– 7 (семь) двухкомнатных квартир общей площадью от 75,46 до 75,66 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 100 долларам США,**

– 19 (девятнадцать) трехкомнатных квартир общей площадью от 93,5 до 93,9 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 100 долларам США;**

– 5 (пять) квартир без выполнения внутренних отделочных работ на 1 этаже, в том числе,

– 2 (две) однокомнатные квартиры общей площадью 45,56 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 150 долларам США,**

– 1 (одна) двухкомнатная квартира общей площадью 51,4 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 150 долларам США,**

– 2 (две) трехкомнатные квартиры общей площадью 93,53 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 050 долларам США.**

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере **30 % стоимости** объекта долевого строительства в течение **7 (семи) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Стоимость квартир фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

Документы для заключения договоров будут приниматься с **25.06.2018**, понедельник с 8.30 до 17.30 (обед с 13.00 до 13.45), вторник с 8.30 до 13.00, среда с 13.45 до 17.30, четверг с 8.30 до 13.00 **по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017)234-16-98, (044)795-44-44**

УНП 192400611

## Извещение о проведении 23 июля 2018 года торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Здание административно-бытового корпуса с ремонтным цехом общей площадью 1680,9 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-56395), в том числе забор ж/б (инв. № 2002039), ограждение склада металла с воротами металлическими (инв. № 2002080), сетчатый забор на металлических столбах (инв. № 2002081), ворота раздвижные с переносной автоблокировкой (инв. № 4255494); КПП общей площадью 28,3 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62092); ангар № 2 общей площадью 439,8 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62093); ангар № 3» общей площадью 545,2 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62094), в том числе навес (инв. № 1002071); хозяйственно-бытовая канализационная сеть (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018641); ливневая канализационная сеть (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018644); хозяйственно-питьевая водопроводная сеть (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018643); тепловая сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018645); кабельные сети электроснабжения (инв. № 3000936); электротельфер (инв. № 4255331); тельфер электрический (инв. № 4255417); кран-балка (инв. № 4255501); лестница (инв. № 4255502); электротельфер (инв. № 4255530); стеллажи (инв. № 7018583); кран-балка, 14 м (инв. № 4255320) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Инженерная, 4Б, 4Б/1, 4Б/2, 4Б/3 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,8651 га, кадастровый номер 500000000002008803 |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 1 748 771,30 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 174 000,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Победитель торгов (покупатель) обязуется согласовать дальнейшее функциональное назначение использования объектов недвижимости с Мингорисполкомом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 года № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации» |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 23 июля 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.06.2018 по 19.07.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Индивидуального предпринимателя на имя Левчик Олега Александровича, УНП 101542772, считать недействительным.

Альфа-Банк

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ФУТБОЛЬНАЯ ЛИХОРАДКА»

Завершилась рекламная игра «Футбольная лихорадка», участие в которой могли принять все держатели банковских платежных карточек, эмитированных ЗАО «Альфа-Банк».

**Для участия в рекламной игре было необходимо:**

– В период с 5 апреля по 29 мая 2018 года зарегистрироваться на сайте football.alfa-bank.by.

– Совершить не менее одной безналичной операции на любую сумму с использованием карты, эмитированной ЗАО «Альфа-Банк».

– В личном кабинете на сайте получить баллы за совершенные платежи.

– Обменять накопленные баллы на шансы выиграть приз.

По результатам проведения рекламной игры 724 приза нашли своих обладателей:

- 225 мячей;
- 45 кепок;
- 129 футболок;
- 100 спортивных бутылок;
- 100 Bluetooth-колонок;
- 100 Power bank;
- 25 билетов на матчи чемпионата мира по футболу FIFA 2018.

**Организатор рекламной игры:** общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 19245288.

Место нахождения организатора: 220030, г. Минск, ул. Ленина, 50, 5-й этаж, оф. пом. 1.

**Наименование рекламной игры:** «Футбольная лихорадка».

**Срок начала рекламной игры:** 5 апреля 2018 г.

**Срок окончания рекламной игры:** 10 июля 2018 г.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3241 от 02.04.2018 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Общее количество участников: 7271 человек.

Призовой фонд был разыгран не полностью. Не разыгранные призы остаются в распоряжении организатора.

Полный список победителей рекламной игры размещен на сайте: https://www.alfabank.by/news/chestvovanie-chempionov.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (44) 599-09-05

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

Продавец: ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. (0212) 65 74 28.

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-94455 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Московский, д. 64 площадью 1213,1 кв. м, наименование: магазин, назначение: торговое помещение. Нач. цена: 993 600,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 99 360,00 бел. руб.

Повторный аукцион состоится 23.07.2018 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 20.06.2018 с 8.30 по 20.07.2018 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества; покупатель за свой счет осуществляет гос. регистрацию перехода права собственности на недвижимое имущество, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Обременение: договор аренды до 30.12.2019. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 16.05.2018

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона производится в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. С полной информацией о порядке проведения торгов, оформления участия и определения победителя аукциона можно ознакомиться на сайте marketvit.by. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru

## К сведению акционеров ОАО «Универсам Рига»

Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 30 июля 2018 года в 13.00 со следующей повесткой дня:

1. О результатах работы Общества за 1-е полугодие 2018 года.
2. О выплате дивидендов.

Место проведения – торговый центр «Рига»: г. Минск, ул. Сурганова, 50.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность;

представителю акционера – доверенность.

Регистрация участников собрания с 12.30 до 13.00.

Наблюдательный совет

УНП 100299678

Краіна здароўя

# Калі з'елі нешта не тое...

## Прафілактыка і дапамога падчас харчовых атручванняў

**Атручванні, якія ў спякотнае надвор'е здараюцца часцей, чым у іншую пару года, узнікаюць праз няякасныя прадукты з тэрмінам прыдатнасці, які сышоў, або праз ежу, якая захоўвалася ў неспрыяльных умовах ці гатавалася з парушэннямі санітарных правілаў. Як не сапсаваць сабе летні настрой і адпачынак? Успомнім прычыны атручвання і першую дапамогу пры гэтай немачы.**

Харчовае атручванне — гэта вострае захворванне, якое звычайна суправаджаецца расстройствам стрававання. Яго прычынай становіцца трапленне ў арганізм разам з прадуктамі розных мікраарганізмаў, часцей за ўсё бактэрый. Таксама атручванні нярэдка выклікаюць ядавітыя грыбы і расліны, сабраныя і ўжытыя праз неасцярожнасць ці няведанне.

### ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

Першыя прыкметы атручвання могуць праявіцца праз паўгадзіны пасля ўжывання няякасных прадуктаў, але часцей за ўсё — праз чатыры-шэсць гадзін, а часам — праз суткі. Тыповыя сімптомы — панос, шматразовая рвота, моцная млоснасць. Таксама вы адчуеце слабасць, галавакружэнне, павышэнне тэмпературы, дрыжыкі, болевыя спазмы ў страўніку.



### МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ

Часцей за ўсё атручванне выклікаюць малочныя і кісламалочныя прадукты, торты ці піроожныя з крэмам, глазураваныя сыркі, мяккі сыр, вараная каўбаса, паштэт, яйкі, хатні маянэз, салаты, запраўленыя маянэзам ці смятанай, памідоры і таматны сок.

### ПЕРШАЯ ДАПАМОГА

З першымі прыкметамі харчовага атручвання трэба прамыць хвораму страўнік. Для гэтага можна выкарыстоўваць слабы (бледна-ружовы) раствор марганцоўкі, які варта працадзіць праз папяровы фільтр або чатырохслойную марлю. Таксама падыдзе раствор харчовай соды (1 чайная лыжка на 1 літр кіпячонай, але не гарачай вады) ці паваранай солі (2 сталовыя лыжкі «без горкі» на 5 літраў вады). Раствор для прамывання трэба прыгатаваць загадзя, а патрабуецца яго каля 8—10 літраў. Ён абавязкова павінен быць цёплым, каб не выклікаць пераахаладжэння арганізма, а таксама не замарудзіць перыстальтыку кішэчніка, што тармозіць прасоўванне таксічных рэчываў.

Варта забяспечыць хвораму спакой, калі яго калоціць, захутаць у цёплую коўдру. У першыя суткі лепш устрымлівацца ад ежы. На другі дзень можна прыступаць да булёну, працёртых супоў з гароднін і рысу, паступова меню можна пашыраць. Да поўнага выздараўлення варта пазбягаць марынаваных, вострых, салёных і вэнджаных прадуктаў, якія раздражняюць слізістую страўніка. Піць рэкамендуецца кіпячоную ваду, нямоцны салодкі чай, ягадныя морс і кісялі. А вось газіраваныя напоі катэгарычна забаронены.

### ПРАФІЛАКТЫКА

Найлепшая прафілактыка харчовых атручванняў — прытрымлівацца правілаў гігіены падчас прыгатавання ежы, правільна захоўваць прадукты і праяўляць элементарную пільнасць. Звяртайце ўвагу на колер, пах і смак ежы. Гнілясны пах, кіславаты смак, пашчыпванне на языку павінны насцярожыць. Прыкметай таго, што прадукт сапсаваны, можа быць і змяненне яго кансістэнцыі, з'яўленне на паверхні слізі.

Без шкадавання адпраўляйце ў сметніцу прадукты, якія пакрыліся цвіллю, сапсаваную садавіну і гародніну, нават калі згніў толькі бачок. Гэтак жа паступайце з уздутымі кансервавымі слоікамі і пакетамі з сокам ці кісламалочнымі прадуктамі. Слоік, закручаны жалезнай крышкай, павінен адкрывацца з характэрным гукам, які сведчыць пра тое, што яна была закаркавана герметычна. Калі яго не было, кансервы ўжываць не варта.

Падчас пакупкі абавязкова правярайце дату вытворчасці і тэрмін прыдатнасці прадуктаў, а таксама цэласнасць упакоўкі ■

■ Скажыце, доктар...

# ЦІСК, МІГРЭНЬ ЦІ СТРЭС?

## ЧАМУ БАЛІЦЬ ГАЛАВА

**Хоць раз у жыцці кожны з нас пакутаваў ад галаўнога болю, і часта, спісваючы яго на стомленасць, мы нават і думкі не дапускаем, каб пайсці да ўрача. Тым часам гэты боль можа мець больш за дзясятак прычын — ад больш-менш бясшкодных да тых, што пагражаюць жыццю і патрабуюць неадкладнага ўмяшання медыкаў. Аб прычынах галаўнога болю мы пагутарылі з урачом-неўролагам 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Зояй КУРС.**



***— Зоя Анатолеўна, галаўны боль — гэта заўсёды паталогія?***

— Ёсць такое захворванне, як галаўны боль напружання (ГБН). Ён звязаны з дысфункцыяй перыкраніяльных мышцаў. Дык вось гэты боль не мае структурна-арганічнай паталогіі. Зараз ГБН шырока распаўсюджаны, асабліва сярод людзей, якія займаюцца разумовай працай і вядуць малаірухомы лад жыцця. Гэты боль мае двухбаковы характар, ён дыфузны (рассеяны). Хворыя апісваюць, быццам бы ён сціскае галаву абручом, шлемам ці шапачкай. Боль звычайна ўзмацняецца ў канцы дня, часам пасля стрэсавых сітуацый. І тут эфектыўныя не толькі супрацьзапаленчыя прэпараты — ацыклафенак, кетанал, дыклафенак, дадаткова прызначаюцца міярэлаксанты — лекавыя сродкі, якія зніжаюць тонус мускулатуры. У спалучэнні з прэпаратамі добра дапамагае масаж шыйнага аддзела пазваночніка, а таксама фізіялячэнне, у прыватнасці, дарсенваль.

Але перад тым, як прымаць той ці іншы прэпарат, важна пабываць ва ўрача і прайсці абследаванне. Бо адрозніць галаўны боль напружання ад, скажам, мігрэні не заўсёды можна без дапамогі спецыяліста.

***— Чым яны, дарэчы, адрозніваюцца?***

— Мігрэнь — пераважна жаночая праблема, хоць часам сустракаецца і ў мужчын. Тут галаўны боль, у адрозненні ад ГБН, іншага характару — прыступападобны. Прычым баліць палова галавы, правая ці левая. Мігрэнь развіваецца ў некалькі стадый: спачатку сасуды расшыраюцца-звужаюцца, утвараецца ацёк, а затым наступае адваротны працэс. Гэта захворванне, як правіла, спадчыннае. Прычыны мігрэні звязаны як са стрэсавымі сітуацыямі, так і з гарманальным фонам. У апошнім выпадку боль часта пачынаецца ў дзяўчынкі разам з менструальным цыклам і зацiхае, як правіла, у клімактэрычны перыяд, калі ўзровень гармонаў зніжаецца. Мігрэнь можа справакаваць і харчаванне, у прыватнасці, такія прадукты, як чырвонае віно, сыр, шакалад. Улічваючы, што захворванне спадчыннае, яно можа працякаць па-рознаму. Папярэднічаць могуць, у прыватнасці, светаўспышкі, адчуванні пахаў, але тут усё вельмі індывідуальна. Дарэчы, мігрэнь нават уваходзіла ў пералік захворванняў, якія маюць супрацьпаказанні для кіравання аўтамабілем, бо па механізме ўтварэння яна блізкая да эпілепсіі. Таксама ўзнікае ачаг узбуджэння, у яго ўцягваюцца структуры мозга, але ў адрозненне ад эпілепсіі тут іншыя наступствы.

Падчас мігрэні — адразу як толькі пацыент адчувае, што з'яўляецца галаўны боль — неабходна прыняць эфектыўны для яго абязбольвальны прэпарат. Пачынаць варта з простых, нестэроідных супрацьзапаленчых, а калі яны не дапамагаюць, прызначаюць больш моцныя сродкі. Аднак своечасовасць тут адыгрывае вырашальную ролю. Калі прыступ ужо пачаўся, няма сэнсу прымаць прэпараты ўпакоўкамі, трэба ўсвядоміць, што вы спазніліся, і чакаць, пакуль гэты боль пройдзе. Нават калі прымаеце прэпарат своечасова, важна не перадазіраваць, бо ў адваротным выпадку можа ўзнікнуць абузусны галаўны боль — ад прыёму вялікай колькасці лекаў.

***— Праз які час гэты боль праходзіць?***

— Мігрэнозны прыступ звычайна доўжыцца да сутак. Можа перайсці і ў мігрэнозны статус, ён больш працягла, да трох сутак. Змагацца з мігрэнню разам з лекамі дапамагае сон, а яркае святло, розныя гукі наадварот раздражняюць.

***— Чаму непажадана трываць боль падчас мігрэні? Чым ён небяспечны?***

— Сваімі ўскладненнямі. Варта насцярожыцца, калі прыступы мігрэні пачасціліся, сталі больш інтэнсіўныя, чым раней. Можа ўзнікнуць геміплегічная форма мігрэні, калі на фоне болю з'яўляецца слабасць у руцэ ці назе, якая потым праходзіць. Адным з ускладненняў можа стаць і інсульт. Таму пацыенты з мігрэнню патрабуюць назірання і абследавання, як зрэшты, і ўсе хворыя з галаўным болем. Неабходна зрабіць МРТ галавы па сасудзістай праграме, каб выключыць такія больш сур'ёзныя паталогіі, як анеўрызмы, пухліны, якія могуць патрабаваць аперацыйнага лячэння.

***— Якія яшчэ могуць быць прычыны галаўнога болю?***

— Напрыклад, глісныя інвазіі, калі паразіты становяцца прычынай новаўтварэння — кісты. Кісты галаўнога мозга, гемангіомы таксама могуць стаць прычынай галаўнога болю. На прыёме ўрач можа выявіць і неўралагічную сімптаматыку: рознасць у рэфлексах, кардынаторныя парушэнні, змены паводзінаў, змены палёў зроку. Галаўны боль у любым выпадку павінен прымусіць неўролага задумацца і шукаць яго прычыну.

Прычынай болю становіцца і праблема з шыйным аддзелам пазваночніка, так званая вертэбрагенная цэрвікалгія. Нагрузка на пазваночны слуп з-за нашага вертыкальнага становішча вялікая, і тут з-за аднаго аддзела, дзе ёсць парушэнні, могуць пакутаваць і ўсе астатнія. Калі галаўны боль раней не турбаваў, а раптам з'явіўся, ён можа сведчыць і пра інфекцыйныя захворванні, у тым ліку такія грозныя, як менінгіт, энцыфаліт, якія з яго і пачынаюцца. Прычынамі болю могуць быць траўмы, павышэнне артэрыяльнага ціску. У апошнім выпадку ў галаўным мозгу ніякай паталогіі няма. Калі павышаецца артэрыяльны ціск, спачатку ніякіх змяненняў не адчуваецца, пасля звужаюцца сасуды, парушаецца кровазварот, і развіваюцца дыфузныя галаўныя болі. Пацыенты скардзяцца на галавакружэнні, шум у вушах, кардынаторныя парушэнні, так званыя хістанні.

***— Але далёка не заўсёды з галаўным болем мы ідзём да ўрача. Як часта павінен турбаваць боль, каб гэта было нагодай звярнуцца па медыцынскую дапамогу?***

— Па-першае, калі з'явіўся моцны галаўны боль, які непакоіць, у гэты момант і трэба звяртацца да медыкаў. Вострыя галаўныя болі могуць сведчыць пра субарахнаідальнае кровазліццё (кровазліццё ў поласць паміж павуціннай і мяккай мазгавымі абалонкамі), унутрымазгавыя гематомы. Па-другое, калі ў вас галаўны боль кожны месяц, то гэта ўжо часта, і нагода прыйсці да доктара ёсць, не кажучы пра тое, калі боль турбуе некалькі разоў у месяц, што ўжо зашмат.

Звяртацца да ўрача неабходна, але гэта не значыць, што вам адразу прызначаць такое складанае абследаванне, як МРТ. Часта, каб выявіць прычыну болю, дастаткова нават самых простых аналізаў. У прыватнасці, зніжэнне гемаглабіну можа выклікаць і галаўны боль, і галавакружэнні.

***— Які яшчэ галаўны боль лічыцца «дрэнным»?***

— З пульсіруючым, рэзкім болем, які суправаджаецца млоснасцю і рвотай, болямі ў патыліцы, звяртацца да ўрача трэба неадкладна, каб выключыць выпадкі, якія патрабуюць хуткага ўмяшання. Адразу павінен насцярожыць начны і ранішні галаўны боль, што сведчыць пра парушэнні вянознага адтоку. Так сябе праяўляюць пухліны. Калі галава баліць у канцы дня, то лагічна спісаць гэта на стомленасць. А вось пасля ночы чалавек павінен адпачыць і не адчуваць болю.

***— Комплекс якіх прэпаратаў варта прымаць для лячэння галаўнога болю?***

— Падчас прыступу прызначаюцца абязбольвальныя, супрацьрвотныя, прэпараты для зняцця спазму і заспакаяльныя сродкі. У міжпрыступны перыяд лячэнне крыху іншае. Калі ў пацыента няма супрацьпаказанняў, спадарожных паталогій, то карысны масаж, разнастайныя жамчужныя ванны, вітамінатэрапія, антыаксіданты, нейрапратэктарная тэрапія, а таксама выкарыстоўваюцца простыя прэпараты-антыдэпрэсанты — такія, як мебікар, адаптол, наафен. Калі ж хворы цалкам абследаваны і ніякай паталогіі не знойдзена, неўролаг дзейнічае сумесна з псіхатэрапеўтам, прызначаюцца ў тым ліку і рэлаксуючыя прэпараты для зніжэння ўспрымання болевага адчування ■



**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# КАЛЯ САМАГА ЦІХАГА АКІЯНА



Такіх маляўнічых пейзажаў на расійскім ціхаакіянскім узбярэжжы незлічонае мноства.

**Аўтар матэрыялу раней працаваў у «Звяздзе». Але і цяпер, бываючы ў новых творчых паездках, не забывае родную газету. Сёння мы прапануем яго нататкі з нядаўняга падарожжа на расійскі Далёкі Усход, падрыхтаваныя спецыяльна для «Звязды».**

## Хто на поўдзень, хто на захад... Я — у іншы бок

На Далёкім Усходзе я бываў у часы Савецкага Саюза — па размеркаванні. Цяпер вырашыў наведаць той край яшчэ раз. У расійскіх перавозчыкаў цяпер здаровая канкурэнцыя, яна на руку падарожнікам. Таму білет у край сваёй маладосці вылавіў па вельмі лагоднай цане.

На лініі Масква—Уладзівасток задзейнічаны магутныя аэробус, які бярэ на борт больш за паўтысячы пасажыраў адразу. Пасля ўзлёту злавіў сябе на думцы: нават проста паглядзець цуд сучаснага авіябудавання — на жаль, не нашага — тых грошай варта. Пасажыру выдаюць тапкі і зубную шчотку з пастай. Кормяць смачна, не скнарнічаюць. Хочаш — кіно глядзі ў персанальным маніторы або гульнямі забаўляйся, хочаш — карту палёту сачы або від з кабіны пілота.

І хоць у Прымор'і панавала непагадзь, такому гіганту тайфун быў не страшны, селі мякка. Затое «дробную авіяцыю» ліўні прыціснулі да зямлі. А мне ад Уладзівастока трэба было яшчэ далей ляцець. Каля паўсутак прыйшлося прамучыцца ў аэрапорце, чакаючы надвор'я. Аэрадром прызначэння — раённы цэнтр Кавалерава. З Уладзівастока па сушы скрозь хрыбты Сіхатэ-Аліня, туды з паўдня зойме дарога. А паветраным шляхам — гадзіна лёту. Хвойны пах адчуваю адразу, як пакідаю самалёт. Паветра цудоўнае — вакол тайга, а мясцовая прамысловасць ніякай небяспекі для экалогіі не ўяўляе. Той эканомікі, якой славілася Кавалерава ў савецкія часы, проста не стала. Спыніўся горна-абагачальны камбінат, зачыніліся і шахты, што здабывалі яму руду.

Калі не ўнікаць у эканамічныя рэаліі, таёжны пасёлак выглядае, вядома, каларытна. У ім адчуваецца гэтакі здаровы дух расійскай глыбінкі, дзеля якога не цяжка далёкі шлях пераадолець. Праз пасёлак працякае рака з аднайменнай назвай Кавалераўка. З паветра бачыў, як падужэлыя пасля ліўняў яе воды падмылі жылы дом на ўскраіннай вуліцы. Накіроўваючыся пасля да скалы, названай у гонар героя твораў Арсеньева Дэрсу Узала — мясцовай адметнасці, — хацеў і падтоплены дом паглядзець. А хаты і не аказалася — змыла яе разам з агародам хуткая Кавалераўка. Засталіся толькі жыхары і вынесены хатні скарб.

## Справы ваенныя

Палюбаваўшыся пасялковымі прыгажосцямі, грузім у машыну ўсё неабходнае і накіроўваемся да акіяна. Закупляючы прадукцыю ў дарогу, мясцовыя выбралі беларускую згушчонку. Яна каштуе даражэй за астатнія, але далёкаўсходнікі лічаць: толькі беларускі прадукт і захаваў ранейшы натуральны смак.

На акіян мяне вывез былы ракетабудаўнік Канстанцін. Ён некалі пасля школы здолеў адсюль паступіць у вядучую ВНУ савецкага ракетабудавання. Як выдатніка вучобы яго размеркавалі ў канструктарскае бюро, дзе распрацоўваліся рухавікі самых грозных ваенных ракет. Прапрацаваў там нямала і работай быў задаволены. Але ў адзін момант адважыўся кінуць Маскву, ракеты і вярнуцца дадому.

Накіроўваемся ў Ольгінскі раён, да заліва Уладзіміра. Рускія маракі адкрылі для сябе гэты заліў у ліпені 1857 года якраз напярэдадні свята Святога Уладзіміра. У гонар святога і назвалі. Заліў вельмі прыгожы, з цікавай гісторыяй. У яго глыбінях ляжыць прадмет любові дайвераў — крэйсер «Ізумруд», затоплены рускімі маракамі пасля прарыву з Цусімскай бітвы. Доўгія гады наваколле лічылася строга забароненай зонай. Мыш туды не магла праслізнуць. У заліве Уладзіміра дыслакаваліся дывізія атамных падводных лодак Ціхаакіянскага флоту і сховішча ядзерных боепрыпасаў для іх. Адсюль грозныя атамаходы адпраўляліся да маршрутаў баявога патрулявання па ўсім сусветным акіяне.

Базу закрылі ў 1994 годзе, і гарадок падводнікаў з марской назвай Ракушка асірацеў. Вялікія прычальныя пірсы і напаўразбураная тэхнічная зона пустуюць. А вось жылы гарадок не знік. Там засталіся тыя, каму пасля флоцкай службы з'язджаць не было куды. У пяціпавярховіках суседнічаюць жылыя і кінутыя кватэры — з выбітымі дзвярамі і вокнамі. Як выжываюць зімой былыя ўладары атамных субмарын і іх сем'і, калі кватэры за сцяной замятае снегам, — цяжка нават уявіць. У Ракушцы застаўся і помнік экіпажу лодкі К-129, якая загінула на баявой службе ў акіяне. Ён зроблены ў выглядзе баявой рубкі атамахода — і таксама прыходзіць у заняпад. Хоць адстаўныя маракі, як могуць, рамантуюць мемарыял загінулым калегам, бур'ян вакол выкошваюць.



Міма гэтага маяка дзесяцігоддзямі вырульвалі атамныя субмарыны на баявую службу ў акіян.

## Палатачная рабінзанада

Летам і ранняй восенню на ўзбярэжжы Японскага мора вырастаюць палатачныя гарадкі. Адпачывальнікі прыбываюць на аўтамабілях — у асноўным праварульных — з Хабараўска, Камсамольска, нават з далёкага Якуцка. Пакуль яшчэ не сезон, і свабодна месца колькі заўгодна. Мы разбіваем палаткі на мысе Балюзек, адкуль добра відаць выхад у акіян. Гарлавіна вусця недзе пад тры кіламетры. Ваенныя пасля прыходу лодак закрывалі яе жалезнымі сеткамі — уяўляеце моц тых механізмаў?! Пазней дэмантаваць гэтыя цуда-сеткі не сталі або не змаглі. Так і засталіся яны ржавець у глыбінях. Плаваць у тым раёне і сёння небяспечна — раптам узнікаюць і бурляць-кружаць магутныя плыні. Мае знаёмыя вырашылі ў пагодны дзень праплысці на вёслах ад аднаго мыса да другога. А акіян узяў і прачнуўся. І панесла шлюпку... Ледзь выграблі, а потым на беразе доўга ад стрэсу адыходзілі.

У ліпені вада яшчэ даволі халодная. Шмат водарасцяў — тут нават існаваў калісьці заводзік па нарыхтоўцы марской капусты. Ужо ідзе на нераст першы ласось. Водзіцца грабеньчык. Сустракаецца і марскі агурок — тут ён завецца трэпанг. За ласосем палююць дзеля чырвонай ікры. Грабеньчык смачны, нават калі есці сырым. На трэпангу можна добра зарабіць. Літровы слоік настойкі з трэпанга на мёдзе, якая лічыцца лячэбнай, ідзе за дваццаць-трыццаць долараў. Вядома, промысел ласасёвых, як і грабеньчыка з трэпангам, знаходзіцца пад забаронай. Але рыбакоў усё роўна хапае. Рыбацкая справа — тым больш у браканьерскім статусе — занятак рызыкоўны і не кожнаму па сілах. Патрабуецца вырашыць тры пытанні. Асвоіць апусканне з аквалангам, умець весці пошук у ледзяных глыбінях. І потым уцячы ад рыбааховы. І яшчэ трэба ўмець абыходзіцца з уловам. Грабеньчык, сціскаючы ў ахоўным рефлексе створкі панцыра, здольны моцна парэзаць рукі. А трэпанга трэба зберагчы пры транспарціроўцы, інакш самаліквідуецца, вывернуўшыся навыварат — зрабіўшы своеасаблівае харакіры.

Калі не паленавацца некалькі гадзін караскацца скрозь стромкія прыбярэжныя скалы, можна выбраць сабе персанальную бухту для адпачынку на бязмежным акіянскім беразе. І гэта таго варта. Прабірацца па скалах няпроста, але ўяўленне сябе стапрацэнтным рабінзонам каля самага вялікага акіяна планеты — пачуццё, якое нельга выказаць. Пашанцавала нават нерпаў убачыць — адразу чацвярых. Чалавека яны, відаць, не моцна баяцца. Але калі жвава рванулі з вады на прыбярэжныя камяні, прымусілі і мяне пахвалявацца. Паводзіны звяркоў сігналілі хутчэй за ўсё аб з'яўленні драпежнікаў. Відаць, да берага падышлі грозныя касаткі. У апошнія гады і акулы сталі падымацца сюды з паўднёвых шырот.

Промысел прыродных багаццяў тут і раней вёўся актыўна, а цяпер набыў нябачаны размах. Тыгры з леапардамі, якія тут вадзіліся стагоддзямі, апынуліся на мяжы знікнення. Трафей гэты для браканьера зайздросны. Перакупшчыкі за тушу звера плацяць ад пяці мільёнаў рублёў. Прыродаахова спрабуе змагацца. Але парушальніка трэба злавіць на гарачым і даказаць яго віну. А сустракаюцца ж і такія высокапастаўленыя паляўнічыя, якім зямныя законы не пісаныя.

Давялося сустрэць у тайзе прамыславіка. Той спачатку паспрабаваў ухіляцца ад размоў. Але даведаўшыся, з якіх я краёў, падабрэў. «А тыгра забіваць даводзілася?» — не ўтрымаўся я ад пытання. «Мой таварыш па неабходнасці страляў. Тыгр на яго першы скокнуў. Можа, прыхварэў і на звера не мог паляваць. Або са свайго ўчастка прыбраць хацеў. Яму ж кілаграм пяцьдзясят мяса ў дзень трэба, таму пільна сочыць за пагалоўем на сваім абыходзе, як і за тым, каб канкурэнтаў там не было. Сам я аднойчы наткнуўся на трупы тыгра і мядзведзя — лічы, у абдымку ляжалі. Тыгр атакаваў удала, але і мішка злаўчыўся рвануць жывот паласаціку. Шкада, што позна я іх знайшоў, і тушы паспелі пратухнуць. А так бы добра мог прадаць».

## Свая малая радзіма

Некалькі дзён стаяў побач з нашай палаткай егер з нетыповым для тутэйшых мясцін прозвішчам Пазняк. «Так, мае бацькі з Віцебшчыны сюды пераехалі, і я беларусам запісаны. Хоць сам у Беларусі ніколі не быў». Па адукацыі ён — інжынер-сейсмограф. Запатрабаваная была раней гэтая прафесія на Далёкім Усходзе. А зараз і ў сейсмографаў работы не стала. Прыйшлося ў егера перакваліфікавацца.

Пра наш палатачны лагер пайшла пагалоска. Нават кіраўніцтва раённай паліцыі ўшанавала прысутнасцю. Не кантраляваць — для гэтага, напэўна, простага сяржанта паслалі б. Падпалкоўнік адолеў доўгую дарогу проста пацікавіцца, як цяпер жывецца ў Беларусі. Іншы мясцовы начальнік прыкаціў... пачаставаць пловам. Лепей яго ва ўсёй акрузе ніхто гатаваць не ўмее. Сам ён — немец па нацыянальнасці. У савецкія часы яго продкаў сюды з Паволжа выслалі. Зараз уся радня на гістарычнай радзіме — у Германіі. З'язджаў туды і ён. Работу добрую знайшоў, уладкаваўся. А потым усё ж вярнуўся. Не могуць яны без гэтых абшараў. Без краю з вельмі няпростым жыццём. Але роднага. Пасля якога ў Еўропе здаецца вельмі цесна.

## Уладзівасток — горад нашанскі

Цяпер Уладзівасток уваходзіць у дзясятку найлепшых расійскіх цэнтраў турызму. Летась яго наведала тры мільёны гасцей. У горадзе налічваецца каля 500 архітэктурных помнікаў. Такія выдатнасці, як музей «Уладзівастоцкая крэпасць», які ўключае больш за сто фартыфікацыйных збудаванняў, Прыморскі акіянарыум, раскансерваваны музей Дальзавода, мемарыял з караблём-музеем «Чырвоны вымпел» і падводнай лодкай С-56 — падобны арыгінальны турыстычны асартымент наўрад ці дзе яшчэ сустрэнеш.

У савецкія часы да 15—20 % гарадскога насельніцтва складалі вайскоўцы — такі лёс горада-гарнізона на Ціхім акіяне. Падчас апошняга перапісу ў 2010 годзе з 600 тысяч насельніцтва Уладзівастока 1642 жыхары назвалі сябе беларусамі.

...У дзень адлёту выпала некалькі вольных гадзін проста паблукаць па Уладзівастоку. Прыяцелі дамовіліся са знаёмым, каб той пабыў маім гідам. У прызначаны час на дарагім джыпе падкаціў імпазантны мужчына. Вазіў усюды, куды прасіў. І па горадзе, і на востраў Рускі па новазбудаваным мосце, і да ўсіх памятных месцаў.

Хітра прыжмурыўшыся, спытаў: як там справы на радзіме? Гадоў пятнаццаць яе, маўляў, ужо не наведваў. Аказалася, таксама наш зямляк. Родам з Оршы. Служыў авіятарам на крэйсеры «Мінск» — туды папрасіўся пасля ваеннага вучылішча. Эксплуатаваў карабельныя самалёты і да гэтага часу пра іх з захапленнем расказвае. У 1994 годзе грозны авіяносец прадалі Кітаю, ваенных скарацілі. Рызыкнуў паспрабаваць абжыцца на далёкаўсходняй зямлі — і атрымалася. Цяпер аршанец — зусім не апошні бізнесмен Уладзівастока. Але, кінуўшы свае справы, ахвотна пагадзіўся сустрэцца з незнаёмым земляком. Чаму? Я так зразумеў, што ў жыцці тут у яго зараз ёсць усё. Толькі востра не хапае магчымасці хоць з кім-небудзь перакінуцца парай слоў па-беларуску.

**Вікенцій КЛЮЧНІК.**

*Мінск—Уладзівасток—Мінск.*



Усё, што засталося ад звышсакрэтнай базы падводнікаў.



Той самы апусцелы горны камбінат.

# ЗАЛАЦІЛІНСКАЕ ЛЕТА

МАСТАК-ЖЫВАПІСЕЦ Віктар ЗАЛАЦІЛІН так гаворыць пра складнікі свайго творчага натхнення: родная хата, рака Нёман і чатырохногі сябар па мянушцы Вольф. І, канешне, цішыня! Усё гэта аб'яднаць — і пейзажы на яго карцінах зайграюць ранішнімі промнямі, залацістым туманам, празрыстым паветрам. «Жыццё павінна быць светлым і радасным», — сцвярджае ў сваіх творах Залацілін.

Хату мастака ў вёсцы Купіск Навагрудскага раёна пабудаваў дзед — адразу пасля вайны, бо перад самым вызваленнем вёска згарэла. Нёман падыходзіць да самага агарода, а ў буйныя паводкі нават і да гаспадарчых пабудоў. Да берага заўсёды прывязана Віктарава «чайка» — так называюць у Панямонні лодкі-пласкадонкі. На супрацьлеглым беразе — бязлюдная пойма, бяскрайнія лугі і пушча. Больш за ўсё Віктар любіць бываць менавіта там, сярод незлічоных матываў для чарговых карцін. Мастака заўсёды суправаджае Вольф — старая нямецкая аўчарка. Вясковец ведае цану гэтага сяброўства.

Віктару сёлета 63 гады. У яго неспатольная душа. У вёску вярнуўся пасля мітуслівага сталічнага жыцця. За плячыма дзве вышэйшыя адукацыі, пакінуты бізнес і няпростыя абставіны, звязаныя з фізічнымі абмежаваннямі. Малая радзіма стала для яго не толькі прыстанкам спакою, але нават сапраўдным алімпам: тут ён зрабіўся майстрам жывапісу, набыў свой уласны творчы стыль. Не толькі сябе — свой Купіск зрабіў вядомым на ўсю краіну. Напісаў сотні палотнаў, правёў дзясяткі персанальных выстаў. Адна з іх цяпер праходзіць у Навагрудскім музеі Адама Міцкевіча. Матыў творчасці Віктара раскрываецца ў назве аднаго з яго твораў: «Дарогамі майго дзяцінства».

А яшчэ Віктар Залацілін даўні падпісчык «Звязды». Спачатку яго маці на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў атрымлівала нашу газету, а цяпер і ён працягвае традыцыю.

Больш здымкаў пра незвычайнага купіскага жыхара можна паглядзець на сайце zviazda.by.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**













**Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.**

# ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЗАЩИТИ ДЕРЕВО – ВЫИГРАЙ АВТО»

В настоящих правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**игровой продукт** – товар, реализуемый на территории Республики Беларусь под товарным знаком VIDARON в период с 25 июня 2018 года по 26 августа 2018 года включительно.

**Рекламный (Игровой) код** – это семизначное число, которое присваивается участнику при соблюдении правил участия в рекламной игре «ЗАЩИТИ ДЕРЕВО – ВЫИГРАЙ АВТО» (далее – рекламная игра).

**Розыгрыш** – розыгрыш рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами рекламной игры.

**Участник** – физическое лицо, достигшее 18 лет, которое приобрело один или несколько игровых продуктов в одном кассовом (товарном) чеке на сумму 40 и более белорусских рублей и выполнило требования, необходимые для участия в рекламной игре.

**Кассовый (товарный) чек** – документ, подтверждающий факт приобретения Игровых продуктов, перечисленных в п. 8 настоящих правил, который должен содержать сведения о номере документа, наименование продавца (торгового объекта, где были приобретены игровые продукты), дату продажи, наименование, количество и цену товара, итоговую сумму покупки. В случае если кассовый (товарный) чек не содержит какие-либо из этих данных, он является недействительным.

**Интернет-сайт** – igravidaron.by

**Персональные данные** – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо для участия в рекламной игре зарегистрировать на Интернет-сайте igravidaron.by.

Для участия в игре необходимо зарегистрировать следующие персональные данные:

– фамилия, имя, отчество физического лица;

– адрес пребывания, проживания в Республике Беларусь, с указанием почтового индекса, области, района, населенного пункта, улицы (при наличии), дома, корпуса (при наличии), номера квартиры (при наличии);

– абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи в международном формате;

– адрес электронной почты;

– номер и дату кассового (товарного) чека;

– место приобретения товара, а именно название и адрес магазина, с указанием области, района, населенного пункта, улицы , дома, корпуса (при наличии).

**Порядковый номер участника –** это семизначный номер, который присваивается участнику в соответствии со временем и датой регистрации на сайте igravidaron.by с 25 июня 2018 года по 26 августа 2018 года включительно. Порядковые номера участников присваиваются, начиная с порядкового номера 0000001. Последующие порядковые номера участников присваиваются путем увеличения предыдущего порядкового номера на одну единицу (0000002, 0000003, 0000004, 0000005 соответственно). Участник вправе зарегистрировать неограниченное количество кассовых (товарных) чеков, таким образом ему будет присвоено соответствующее количество порядковых номеров для участия в розыгрыше.

**1. Организатор рекламной игры**

Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Тотем Адвертайзинг», Республика Беларусь, 220012, г. Минск, ул. Калинина, 9, кабинет 7, УНП 191752255, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 06.04.2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191752255.

**2. Заинтересованное лицо рекламной игры**

Заинтересованным лицом рекламной игры является Совместное общество с ограниченной ответственностью «Снежка-БелПол», УНП 800019332, Республика Беларусь, 222160, Минская область, г. Жодино, ул. Дорожная, д. 3, каб. № 1, зарегистрированное Минским облисполкомом 26.03.2003 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800019332.

**3. Участники рекламной игры**

К участию в рекламной игре приглашаются все граждане республики Беларусь, достигшие 18 лет, а также иностранные граждане и лица без гражданства, достигшие 18 лет, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

К участию в рекламной игре не допускаются лица, состоящие в трудовых отношениях с организатором рекламной игры, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Название рекламной игры:** «ЗАЩИТИ ДЕРЕВО – ВЫИГРАЙ АВТО»

**5. Территория проведения рекламной игры:** Республика Беларусь

**6. Дата начала рекламной игры:** 25 июня 2018 года

**7. Дата окончания рекламной игры:** 25 сентября 2018 года

**8. Наименования товаров (игровых продуктов), в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра:** весь ассортимент товаров, реализуемый под товарным знаком VIDARON

**9. Призовой фонд рекламной игры**

**9.1.** Призовой фонд рекламной игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица в размере 31 297,88 (тридцать одна тысяча двести девяноста семь) белорусских рублей 88 копеек. Призовой фонд рекламной игры включает следующие призы:

| Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость за ед., бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Бейсболка белая (далее бейсболка) | 100 | 8,60 | 860,00 |
| Гриль угольный Weber Original Kettle, 47 см, черный | 4 | 460,00 | 1840,00 |
| и денежные средства в размере (далее – гриль) | | 50,5 | 202,00 |
| Электрогазонокосилка ELM3711 MAKITA | 2 | 276,00 | 552,00 |
| и денежные средства в размере (далее – электрогазонокосилка) | | 23,01 | 46,02 |
| Главный приз: Автомобиль KIA RIO FB VIN Z94C251AAJR017883 | 1 | 24 200,00 | 24 200,00 |
| и денежные средства в размере (далее – автомобиль) | | 3597,86 | 3597,86 |
| | | | 31 297,88 |

**10. Порядок участия в рекламной игре:**

**10.1.** Для участия в рекламной игре физическим лицам, указанным в п. 3 настоящих Правил, в период с 25 июня 2018 года по 26 августа 2018 года включительно необходимо:

**10.1.1.** Приобрести на территории Республики Беларусь у юридических лиц или индивидуальных предпринимателей игровые продукты, указанные в п. 8 настоящих правил, на сумму 40 и более белорусских рублей в одном кассовом (товарном) чеке;

**10.1.2.** Зарегистрировать свои персональные данные на сайте igravidaron.by;

**10.1.3.** За каждый зарегистрированный кассовый (товарный) чек присваивается один порядковый номер участника и высылается на указанный адрес электронной почты в день регистрации. Участник вправе зарегистрировать неограниченное количество кассовых (товарных) чеков. Данные одного кассового (товарного) чека, зарегистрированного в порядке, установленного настоящими Правилами, вне зависимости от стоимости купленных игровых продуктов могут принимать участие в рекламной игре только один раз. Для регистрации каждого кассового (товарного) чека и получения всех последующих порядковых номеров участника необходимо проходить процедуру регистрации персональных данных участника рекламной игры заново соответствующее количество раз.

Осуществляя процедуру регистрации своих персональных данных, участник выражает свое согласие с настоящими Правилами проведения рекламной игры.

**10.2.** К участию в рекламной игре не допускаются:

физические лица, не соответствующие требованиям, указанным в п. 3 настоящих Правил;

участники, совершившие покупку до 25.06.2018 года или после 26.08.2018 года;

